

У ТРЭНДЗЕ – СЦЕНЫ З ГІСТОРЫЯЙ

ЧЫМ ЗДЗІВЯЦЬ ЗІМОВЫЯ АЛІМПІЙСКІЯ ГУЛЬНІ 19



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 ЖНІЎНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 159 (29528)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ШЧАРБАКОЎ, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях:**

*«Самае амбіцыйнае, што мы плануем рэалізаваць у рамках гэтай пяцігодкі, — так званыя комплексныя праекты будучыні. Гэта асаблівыя і маштабныя праекты, якія стануць кропкай росту нашай інавацыйнай эканомікі. Цяпер яны ўжо сфарміраваныя, і трэба сказаць, што фарміраваліся складана, таму што трэба было выбраць сапраўды тое, што стане драйверам далейшага росту. Сярод іх — нацыянальны электратранспарт, біятэхналогіі ў аграпрамысловым комплексе, дакладнае земляробства, інавацыйная ахова здароўя, біятэхналогіі для фармацэўтыкі, разумныя гарады Беларусі. Гэта тыя праекты, якія атрымаюць прыярытэтнае фінансаванне».*

# СЕЗОН САЛОДКАЙ ЯГАДЫ

**У вёсцы Дашкі, што ў Мінскай вобласці, працуе калектыўная фермерская гаспадарка «СідСад». Плошча плантацый складае 61 гектар, дзе вырошчваюць бружмель, журавіны, гародніну і духмяныя травы. Асноўны прадукт гаспадаркі — буякі. За сезон збіраюць да дзесяці тон блакітнай ягады. Падчас збору ўраджаю з'яўляецца праца мясцовым жыхарам вёскі Дашкі. Гэтая гаспадарка — добры прыклад дзейнасці прыватнага бізнесу ў Беларусі. Прадукцыя рэалізоўваецца ў айчынных гандлёвых сетках. У планах фермераў — арганізаваць самастойны збор ягад для гасцей гаспадаркі па прынцыпе: прыехаў — сам назбіраў і заплаціў на выхадзе за сабраную ягаду. А яшчэ рупліўцы-фермеры плануюць наладзіць перапрацоўку ягады. На здымку: ягаду збірае Аляксандра Тарасевіч.**

**Фота Рамана КЛЮЧЫНА.**





## КОРАТКА

- **Аўтапагрузчык «АМКАДОР» уключаны ў пералік прадукцыі ЕАЭС.**
- Першы камбайнер-чатырохтысячнік вызначыўся на жніве ў Гродзенскай вобласці.
- **Заснаваны сцяг органаў пагранічнай службы.**



- ПЛР-тэсты ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск» будуць рабіць кругласутачна.

Сучасны падыход

## ШКОЛА З ВОКНАМІ Ў ЗАЎТРА



Дырэктар дэманструе дыпломы і граматы за апошнія тры гады.

Сёння яны мала нагадваюць тыя школкі «проста ў драўлянай хаце» з печкамі замест цэнтральнага ацяплення, пра якія пісалі нашы класікі. Ёсць школы нават з басейнамі, як у аграгарадку Аўсянка Горацкага раёна або як Хонаўская ў Магілёўскім раёне, куды мы завіталі, — з трэнажорным залай. І на выгляд гэты вучэбна-педагагічны комплекс нічым не адрозніваецца ад гарадской установы. Сучасны двухпавярховік з прасторнымі класамі і, хоць і ў меншай колькасці, але ж таксама з мультымедыйным абсталяваннем. У будынку яшчэ крыху пахне фарбай. Да новага навучальнага года тут кардынальна адрамантавалі за кошт апякунскіх і спонсарскіх грошай клас інфарматыкі і спальны пакой для дашкалят, у астатніх памяшканнях зрабілі касметычны рамонт. Найбольш красамоўная прыкмета вясковай прыналежнасці школы — мова. Яна тут родная, беларуская.

СТАР. 4

Кожны трэці

## «ПЕРШ ЗА ЎСЁ — ПРАЎСЯ І НЕ НЫЙ, БРАЦЕ, НАКОНТ НЕЙКАГА «ЗАКРУГЛЕННЯ»

«Страшней за гэтую кнігу я не ведаю...» Менавіта так адзін расійскі крытык адгукнуўся ў газеце «Комсомольская правда» на кнігу-дакумент «Я з вогненнай вёскі...»




**Яна выйшла ў 1975 годзе ў Беларусі. Кніга-памяць, якая сабрала сотні сведчанняў пра злачынствы фашысцкай акупацыі на беларускай зямлі.**
**На вокладцы значацца тры аўтары: Алесь Адамовіч, Янка Брыль і Уладзімір Калеснік. Усе трое прайшлі вайну, былі партызанамі, бачылі жахі акупацыі на свае вочы. Задума была грандыёзная...**

СТАР. 20–21

ISSN 1990 — 763X
21159>

З першых вуснаў

# «ТЫХ, ХТО СУМЛЕННА Ў НАС ПРАЦАВАЎ, ХТО ХОЧА ДА НАС ПРЫЙСЦІ ПРАЦАВАЦЬ, — ІХ МЫ ПАВІННЫ ПРЫМАЦЬ ЯК СВАІХ ЛЮДЗЕЙ»

**Аб ахове і забеспячэнні фінансава-эканамічных інтарэсаў краіны ішла размова на сустрэчы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з міністрам па падатках і зборах Сяргеем Налівайкам і старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Васілём Герасімавым.**

«Многія пачнуць казаць, што ў нас у бюджэце грошай не хапае, таму мы пра падаткі загаварылі. Гэта звычайныя заявы нашых свядомых пратэстуноў. Дзіўна, але бюджэт складваецца лепш, чым мы думалі і магло быць», — пачаў Прэзідэнт.

Але адзначыў, што пры гэтым нельга адысці ад фундаментальных пытанняў — выплаты падаткаў.

«Выплата падаткаў — справа святая. Я вельмі часта прыводзіў прыклады іншых дзяржаў, дзе адказнасць за парушэнне падатковага заканадаўства самая страшная — у так званых дэмакратычных краінах (ЗША і іншых). Злачынства нумар адзін — нявыплата падаткаў. Таму яны багатыя дзяржавы, бо там любы чалавек нават не мысліць пра тое, каб не заплаціць падаткі ці абысці падатковае заканадаўства. Наперад заплаціць, каб да яго не было прэтэнзій», — заявіў кіраўнік краіны.

Ён дадаў, што ў мінулыя гады дадзена шмат даручэнняў па ўдасканаленні падатковага заканадаўства, таму як ідзе гэтая праца — адно з галоўных пытанняў сустрэчы.

«Каб чалавек мог заплаціць падаткі, ён павінен разумець, за што і колькі ён павінен плаціць. А гэта павінна быць проста і не трэба для гэтага вывучаць вышэйшую матэматыку. Таму падатковае заканадаўства заўсёды патрабуе ўдасканалення. Тым не менш мы пра гэта дамовіліся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік краіны заявіў, што патрабаваць выплаты падаткаў з бізнесменаў з-за падзей у краіне мінулага года пачалі жорстка.

«Ніхто не кажа, што бізнесмен — гэта бяспраўны чалавек, не мае права на ўласнае меркаванне. Але заўсёды падкрэсліваю — і, думаю, разумныя бізнесмены мяне пачулі, — што палітыка і бізнес — рэчы розныя. Усё ў законах не прапішаш, і законы розныя, што ў палітыцы, што ў бізнесе. Любы бізнесмен, які хоча займацца палітыкай, павінен строга кіравацца законам, — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, бываюць выпадкі, калі прадпрымальнік «пракраўся» і пайшоў у палітыку, каб гэта прыкрыць, абвінаваціць уладу.

«Кажуць: «Вось, я сумленны бізнесмен, пайшоў у палітыку, мяне прыціснулі». Некаторыя цяперашнія сядзельцы так сябе і паводзілі. Гэта будзе спыняцца. Я магу сказаць у гэтай сувязі: улада нечага каштуе, калі яна не толькі сябе можа абараніць, але і свой народ», — мяркуе кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ўлада — сур'ёзная справа, і бізнесмены, якія збіраюцца ісці ў палітыку, павінны гэта разумець.

«Яшчэ раз падкрэсліваю. Гэта не значыць, што бізнесменам, кіраўнікам кампаній забаронена ісці ва ўладу. Можна, але для гэтага ёсць выбары. Ідзіце, змагайцеся і будзьце непадкупнымі, паступайце так у жыцці, каб не было за што цябе зачапіць. Як тут адзін з карцінамі накраў мільёны долараў і пайшоў на выбары. Чаго пайшоў? Зразумела: трэба было гэта ўсё прыкрыць», — кажа кіраўнік краіны.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, апошнім часам вельмі прынцыпова па законе адносяцца да тых, хто займаецца прадпрымальніцкай справай. Але пры гэтым, падкрэслівае Прэзідэнт, нельга крыўдзіць сумленных бізнесменаў: «Калісьці я іх сюды запрашаў і абяцаў ім: усё, пра што мы дамовімся на аснове закона, будзем свята саблюдаць. Ні адзін волас з прадпрымальніка, бізнесмена, які да нас прыйшоў і сумленна працуе, не ўпадзе. Мы ні ў якім разе не павінны «задушыць» нейкага бізнесмена ці прадпрымальніка. Людзі працуюць на дзяржаву і прыносяць карысць дзяржаве. Адзінае: падаткі трэба плаціць, людзей, што ў цябе працуюць, не крыўдзіць».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што напярэдадні выбараў ставіў прыватнікам задачу — плаціць работнікам крыху вышэй за сярэдні заробак па краіне.

«Гэта не спадабалася бізнесу. «Як гэта я аддам грошы?» Але ж людзі на цябе працуюць, прыносяць табе грошы. Гэта не значыць, што ты дзесяць працэнтаў ім аддаў, а 90 сабе ў кішэню паклаў. Такі бізнес нікому не патрэбны», — заяўляе Прэзідэнт.

Па словах Прэзідэнта, нельга прыціскаць і за нешта неабгрунтавана караць індывідуальных прадпрымальнікаў, IT-спецыялістаў, якія сябе павялі дрэнна ў складаны для дзяржавы перыяд.

«Нельга проста ўзяць і за нешта іх пакараць. Не трэба шукаць нагоду, прычыны. Хай працуюць па законе. Парушыў закон — няхай на ўсю катушку адказвае. Хтосьці памыліўся, «заблукаў», няправільна зразумеў нешта. Трэба патлумачыць. Я гатовы на сваім узроўні гэта рабіць, калі вы знойдзеце адпаведную форму. Тых, хто сумленна ў нас працаваў, хто хоча да нас прыйсці працаваць, мы іх павінны прымаць як сваіх людзей», — прапануе Прэзідэнт.

Таксама ён папрасіў расказаць, як ідуць справы з барацьбой з «заробкамі ў канвертах».

«Гэта падаткі і паступленні ў Фонд сацыяльнай абароны. Мы ж утрымліваем пенсіянераў, калісьці і нас будуць утрымліваць. Яны ў нас і так небагатыя. Іх крыўдзіць нельга», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Каментарый у тэму

**Міністр па падатках і зборах Сяргей НАЛІВАЙКА** сказаў журналістам пасля даклада, што асноўны пасыл кіраўніка краіны — сумленнаму суб'екту гаспадарання няма чаго баяцца, а калі ён выконвае ўсе падатковыя і сацыяльныя абавязкі, да яго не будзе пытанняў і з боку праверак.

«Пра гэта кажа і статыстыка. У нас за апошнія шэсць гадоў (у параўнанні 2015 года з 2020-м) больш чым у восем разоў знізілася колькасць праверак. Калі ў 2015 годзе было іх больш 50 тысяч па краіне, то па выніках мінулага года іх крыху больш за шэсць тысяч», — заявіў міністр.

Ён акцэнтаваў, што пры ўдасканаленні падатковага заканадаўства ў ведамстве надаюць важнае значэнне электронным сэрвісам і бачаць задачу — пераход да бескантактнага метаду работы з плацельшчыкам.

«На сёння ў нас 83 працэнты суб'ектаў гаспадарання ўжо ўзаемадзейнічаюць у электронным выглядзе з падатковымі органамі. Па праграме ўрада да 2025 года мы павінны выйсці на лічбу ў 90 працэнтаў. Мы стараемся так арганізаваць работу, каб гэта лічба была вышэйшай. Тут няма прымушэння. Сэрвісная частка, умовы, механізмы ўзаемадзеяння простыя, зразумелыя, і людзі павінны самі іх выбіраць», — сказаў міністр і дадаў, што ў заканадаўстве не будзе ніякіх глабальных змяненняў.

Па словах Сяргея Налівайкі, сёння вялікая ўвага ўдзяляецца барацьбе з «заробкамі ў канвертах». Гэта стала адным з галоўных кірункаў работы ведамства.

«Акрамя недапаступлення грашовых сродкаў у бюджэт, тут ёсць рызыка недапаступленняў сродкаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва і невыканання сацыяльных абавязкаў перад самымі сацыяльна неабароненымі пластамі насельніцтва — пенсіянерамі, людзьмі ў дэкрэтных водпусках», — паведаміў ён.

Запыталі ў міністра і пра транспартны падатак, даведкі аб яго выплаце па новай сістэме павінны прыйсці неўзабаве да ўсіх аўтаўладальнікаў. Сяргей Налівайка нагадаў: фізічным асобам, што маюць электронныя кабінеты ў адпаведных падатковых сістэмах, паведамленне ўжо прыйшло. Калі там ёсць недакладнасці, варта звярнуцца ў органы ДАІ.

«Будуць накіраваны апавяшчэнні тым фізічным асобам, у якіх па стане на 1 ліпеня ёсць транспартны сродак. Ім будзе налічаны падатак. Але ў гэтым годзе ідзе авансавы плацеж у рамках адной базавай велічыні», — дадаў міністр.

**Васіль ГЕРАСІМАЎ, старшыня КДК,** расказаў журналістам, што большая частка падаткаў выплачваецца добраахвотна, але ёсць выпадкі свядомай нявыплаты, якімі ведамства займаецца.

«Па сутнасці, мы не ідзём да больш жорсткага пакарання за нявыплату. Так, была ўведзена крымінальная адказнасць за «заробкі ў канвертах», але гэта зона раней была ўпушчана, і некаторыя гэтым скарысталіся», — сказаў Васіль Герасімаў.

Ён прывёў лічбы, што за пэўны час на рашэнне КДК аб выплаце падаткаў была пададзена толькі адна скарга. Старшыня КДК адзначыў, што з моманту ўвядзення крымінальнай адказнасці за «заробкі ў канвертах» узбуджана 21 справа.

«Калі гэта перакласці на колькасць грамадзян, якія атрымліваюць заработную плату, то гэта будзе вельмі маленькі працэнт. Але ёсць факты, калі на фірмах са 100—150 работнікамі выплачвалі заработную плату ў канвертах. Лічбы ішлі не на тысячы, а на мільёны рублёў. Я думаю, што з цягам часу гэтага будзе ўсё менш. Мы разам з Фондам сацыяльнай абароны насельніцтва праводзілі аналіз — многія фірмы ўжо на гэта адрэагавалі і павысілі заработную плату, паказалі той рэальны заробак», — дадаў Васіль Герасімаў.

Па яго словах, у тэлеграм-канал ведамства за два месяцы ўжо звярнулася каля 150 грамадзян, якія паведамілі, што ім выплачваюць «заробак у канвертах».

Акрамя таго, старшыня КДК расказаў журналістам, як ідзе кантроль за правядзеннем уборачнай кампаніі.

«Мы сітуацыю адсочваем штотыднёва з аблвыканкамамі, Міністэрствам сельскай гаспадаркі. Калі правяралі захаванне тэхнікі разам з Міністэрствам унутраных спраў, пытанні былі ў кожнай вобласці. Самая вялікая бяда, калі не ў час рыхтуюць тэхніку», — адзначыў Васіль Герасімаў.

Зараз ведамства збірае інфармацыю, як гэта сітуацыя выпраўлена, і ў большасці, рэзюмаваў кіраўнік КДК, праблема вырашаецца своечасова.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Паліцыя Латвіі распачала крымінальныя справы ў дачыненні да ўдзельнікаў пікету супраць абавязковай вакцынацыі



Дзяржаўная паліцыя Латвіі распачала крымінальныя працэсы ў дачыненні да некалькіх удзельнікаў пікету супраць абавязковай вакцынацыі, які прайшоў 18 жніўня ў Рызе. Пра гэта заявіў начальнік Дзяржаўнай паліцыі Армандс Рукс, паведамляе Delfi.

Па словах Армандса Рукса, крымінальныя справы ўзбуджаны ў дачыненні да пяці чалавек, якія ўчынілі нападзенне на супрацоўніка муніцыпальнай паліцыі. Яшчэ адна крымінальная справа ўзбуджаная за разбітае шкло ў паліцэйскай машыне. Паліцыя канстатавала і некалькі дробных парушэнняў, учыненых людзьмі ў стане алкагольнага ап'янення.

Таксама будзе праведзена ацэнка парушэнняў, звязаных з невыкананнем мерапрыемстваў эпідэміялагічнай бяспекі. Штраф за такое парушэнне можа дасягаць дзве тысячы еўра.

Акцыя пратэсту была ўзгоднена з Рыжскай думай. Аднак, па словах Армандса Рукса, у цяперашняй эпідэміялагічнай сітуацыі на публічных мерапрыемствах не павінна збірацца больш за 50 чалавек. Пры гэтым колькасць удзельнікаў пікету склала каля чатырох тысяч чалавек.

Як паведамлялася, пратэстоўцы сабраліся напярэдадні ў цэнтры Рыгі, каб выступіць супраць каранавірусных абмежаванняў і абавязковай вакцынацыі. Былы міністр эканомікі і экс-міністр зносін Латвіі Айнарс Шлесерс, які ішоў на чале калоны, заявіў, што мэтай акцыі з'яўляецца негвалтоўная змена ўлады. «Людзі, якія сядзяць у нашым урадзе, павінны сысці ў мінулае, гэта наша галоўная мэта, — сказаў ён. — Мы пачалі рэвалюцыю і звяржэнне ўлады, але мірным шляхам».

Урад раней пастанавіў, што вакцынацыя стане абавязковай для медыкаў, сацыяльных работнікаў і тых, хто працуе ў сферы адукацыі. Пры гэтым у працадаўцаў з 1 кастрычніка будзе права звальняць супрацоўнікаў гэтых устаноў, якія не атрымалі сертыфікат вакцынацыі. Законапраект цяпер знаходзіцца на разглядзе ў Сейме.

### ЗША 20 гадоў штодня трацілі 300 мільёнаў долараў на афганскую аперацыю

Дваццацігадовая аперацыя ў Афганістане штодня абыходзілася ЗША ў некалькі сотняў мільёнаў долараў, заявіў вярхоўны прадстаўнік Еўрасаюза па знешняй палітыцы і бяспецы Жозеп Барэль. «ЗША трацілі больш за 300 мільёнаў долараў у Афганістане кожны дзень», — сказаў ён на пасяджэнні камітэтаў ЕС па сітуацыі ў гэтай краіне.

Такім чынам, агульныя фінансавыя ўліванні Штатаў на падтрыманне кантынгенту ў краіне склалі больш за два трыльёны долараў. Пры гэтым, на думку Барэля, вынікі ўсё роўна аказаліся «сціплымі». Змена ўлады стала сапраўднай катастрофай як для народа, так і для іншых дзяржаў, дадаў ён.

Акрамя таго, вярхоўны прадстаўнік ЕС выказаў меркаванне: тое, што здарылася, аказалася нечаканасцю для ўсіх, у тым ліку і для «Талібана».

Калі талібы захапілі Кабул, на амерыканскага прэзідэнта Байдэна з жорсткай крытыкай абрынуліся СМІ і многія палітыкі — як рэспубліканцы, так і дэмакраты. Дональд Трамп і зусім заклікае кіраўніка дзяржавы скласці паўнамоцтвы. Рэйтынг Байдэна знізіўся да 46 працэнтаў — самы нізкі паказчык для яго. Яшчэ тыдзень таму справы ішлі куды лепей: было 53 працэнты. Такія даныя агенцтва Reuters і сацыялагічнай службы Ipsos. Пасля падзення Кабула Дональд Трамп, які падпісаў пагадненне з талібамі ў мінулым годзе ў Досе (вывесці войскі планавалі да 1 мая, але пазней тэрмін працягнулі да 11 верасня), не змог прамаўчаць. «Тое, што Байдэн нарабіў з Афганістанам, — нешта ўнікальнае. Гэта ўвойдзе ў гісторыю як адно з найбольш жорсткіх нашых паражэнняў. Не думаю, каб ЗША былі калі-небудзь настолькі зняважаныя», — сказаў ён.

Разам мы моцныя

# І ВАЛОШКА ЯК СІМВАЛ

## У Магілёве плануюць зрабіць плошчу і знак у гонар народнага адзінства

**Разглядаецца пляцоўка каля Магілёўскага абласнога лячэбна-дыягнастычнага цэнтра і гандлёва-забаўляльнага цэнтра «Атрыум». Ідэю з назвай і ўстаноўкай памятнага знака абмеркавалі на нядаўнім пасяджэнні гарадской тапанімічнай камісіі і горадабудаўнічага Савета.**



У якасці альтэрнатывы разглядалася яшчэ і плошча Леніна, дзе знаходзіцца Дом Саветаў — помнік архітэктуры міжваеннага перыяду, аўтарам якога з'яўляецца Іосіф Лангбард. Будынак быў узведзены ў канцы 1930-х, калі Брэсцкая і Гродзенская вобласці знаходзіліся ў складзе Польшчы. Магілёў у той час збіраліся зрабіць сталіцай Беларусі. Вядомы магілёўскі гісторык Мікалай Барысенка лічыць, што гэта плошча найбольш дакладна перадае дух тых часоў і вельмі цесна звязана з падзеямі 1939 года. Дарэчы, кажуць, што плошча не мае афіцыйнай назвы. Маўляў, у гонар Леніна яе сталі называць проста ў народзе, і назва прыжылася.

Між тым адкрыццё памятнага знака, прысвечанага Дню народнага адзінства, паводле плана мерапрыемстваў вобласці «Беларусь — адзіная: адзінства, развіццё, незалежнасць», прымеркаваных да новага свята, адбудзецца на пляцоўцы каля лячэбна-дыягнастычнага цэнтра *(на фота)*. Дата яго прэзентацыі — 17 верасня. Над стварэннем знака працуе магілёўскі скульптар Аляксандр Мінькоў. Кампазіцыя, паводле яго слоў, будзе ўяўляць сабой трохметровую ў вышыню і метровую ў шырыню стэлу ў выглядзе валошкі з шасцю пялёсткамі зверху і арнаментам беларускага сцяга знізу.

— Шэсць пялёсткаў — гэта шэсць абласцей, з якіх складаецца Беларусь, — кажа Аляксандр. — Для мяне тэма адзінства — гэта тэма Радзімы. Я нарадзіўся ў Беларусі і вельмі люблю сваю краіну. Яна асацыюецца ў мяне менавіта з гэтай палявой кветкай, вельмі простай, але сімвалічнай. Нехта кажа, што гэта вельмі прыземлены вобраз, але ж мы ўсе дзеці зямлі. Спачатку была ідэя зрабіць на стэле яшчэ і каласкі, дзе зярняткі — гэта быццам бы людзі. Шэсць каласкоў — шэсць абласцей, але вырашылі ўсё ж пакінуць толькі валошку. Лаканічнасць твора лепш перадасць яго сэнсавую нагрузку. У якасці матэрыялу выкарыстоўваецца ўральскі граніт. Гэты камень найбольш удала перадасць глыбіню ўсёй кампазіцыі.



Аўтар працуе над стварэннем памятнага знака.

Аляксандр Мінькоў — нязменны ўдзельнік выставачных праектаў і пленэраў «Каменная кветка», яго работы ўпрыгожваюць паркі Магілёва ды іншых гарадоў вобласці. Летась у Бялынічах напярэдадні Дня пісьменства была ўстаноўлена яго скульптура «З'ява іконы» ў выглядзе гранітнага анёла з іконай Божай Маці на грудзях.

У плане па святкаванні Дня народнага адзінства ў Магілёўскай вобласці шмат розных мерапрыемстваў, пачынаючы ад пасадкі памятных алей, аўта- і велапрабегаў, конкурсаў дзіцячага малюнка, урокаў патрыятычнага выхавання і заканчваючы круглымі сталамі, дыялогавымі пляцоўкамі, навядзеннем парадку на сацыяльна значных аб'ектах.

Па словах **начальніка ўпраўлення культуры Магілёўскага гарвыканкама Марыны КЛЕПЧУКОВАЙ**, будзе шмат канцэртаў з удзелам прафесійных і аматарскіх творчых калектываў.

— Сёмага верасня ў Магілёве пройдзе вялікая абласная канферэнцыя з удзелам вядучых палітолагаў, — падзяліўся планамі **начальнік упраўлення ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Алег КОРАПАЎ**. — Акрамя гэтага, рыхтуем вялікі ўрачысты сход і канцэрт, якія адбудуцца 16 верасня. Свята новае, база толькі напрацоўваецца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Надвор'е

# НА ВЫХАДНЫЯ БУДЗЕ ЦЁПЛА

## Толькі з кароткачасовымі дажджамі

**Пра гэта паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Услед за актыўным атмасферным франтам, што прайшоў у аўторак, на тэрыторыю Беларусі пачало паступаць больш халоднае паветра з Заходняй Еўропы. У сярэдзіне тыдня тэмпературны фон у краіне panізіўся і цяпер знаходзіцца ў межах плюс 14—19 градусаў, што ў асноўным каля кліматычнай нормы, а па захадзе краіны на 2-3 градусы ніжэй за яе, пры гэтым максімальная тэмпература паветра вышэй за плюс 19—24 градусаў не ўздымалася.

У найбліжэйшыя дні захаваецца ўплыў атмасферных франтоў і няўстойлівых, але ўмерана цёплых паветраных мас, якія паступаюць з Заходняй Еўропы.

У пятніцу, 20 жніўня, будзе пераважна без ападкаў, толькі днём месцамі па захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 8—14 градусаў. Днём будзе ад плюс 20 на паўночным захадзе да 27 градусаў цяпла па паўднёвым усходзе Беларусі.

У суботу, 21 жніўня, пры праходжанні атмасфернага фронту ноччу пераважна па заходняй палове, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 8—15 градусаў. Днём будзе плюс 18—25, па паўднёвым усходзе краіны да 27 градусаў цяпла.

У нядзелю, 22 жніўня, Беларусь апынецца ў вобласці павышанага атмасфернага ціску, толькі па поўначы краіны адаб'ецца ўплыў няўстойлівых паветраных мас, што паступаюць з Балтыйскага мора. Будзе пераважна без ападкаў, толькі днём у асобных раёнах па поўначы краіны магчымы невялікія кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай прагназуецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 6—13 градусаў. Днём паветра прагрэецца да плюс 16—23, па паўднёвым усходзе — да 25 градусаў цяпла.

У пачатку наступнага тыдня паўднёвая частка краіны будзе знаходзіцца пад уплывам малярухомага атмасфернага фронту, які перамесціцца з паўднёвага захаду Еўропы, пераважна па паўднёвай палове Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Па поўначы краіны, дзе яшчэ будзе адбівацца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску, ападкі малаверагодныя. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 5 па поўначы да плюс 14 градусаў па поўдні. Днём паветра прагрэецца да 15—23 градусаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### СЕРТЫФІКАЦЫІ СУДНАЎ — ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

**Пастановай Міністэрства транспарту і камунікацый ад 2 ліпеня 2021 года № 17 зацверджаны авіяцыйныя правілы «Сертыфікацыя экзэмпляраў грамадзянскіх паветраных суднаў». Пра гэта паведаміла прэс-служба ведамства.**

Правіламі вызначаны парадак правядзення сертыфікацыі экзэмпляраў грамадзянскіх паветраных суднаў, прызначаных для выкарыстання толькі ў авіяцыі агульнага прызначэння і не прызначаных для выканання камерцыйных і міжнародных палётаў.

Яны распаўсюджваюцца на распрацоўшчыкаў, вытворцаў, уладальнікаў, эксплуатантаў экзэмпляраў паветраных суднаў, а таксама трымальнікаў сертыфіката экзэмпляра паветранага судна.

Ведамасная пастанова ад 21 студзеня 2009 года № 9 «Аб зацвярджэнні авіяцыйных правілаў «Сертыфікацыя планёраў, дэльтапланаў, парапланаў, лёгкіх і звышлёгкіх лятальных апаратаў, аэрастатычных апаратаў і паветраных суднаў аматарскай канструкцыі» са змяненнямі прызнаецца страціўшай сілу.

Пастанова набывае моц пасля афіцыйнага апублікавання.

### ГРЫБНІК ЗНАЙШОЎ БОЕПРЫПАС

**У міліцыю паступіла паведамленне аб тым, што недалёка ад вёскі Астраўляны Кобрынскага раёна знойдзены металічны аб'ект, які нагадвае боеприпас часоў вайны.**

Паводле інфармацыі УУС Брэсцкага аблвыканкама, падчас збору грыбоў на полі мясцовы жыхар убачыў каля электрычнай апоры снарад са слядамі карозіі.

Неадкладна на месца здарэння выехалі супрацоўнікі раённага аддзела і сапёрна-піратэхнічная група в/ч 5526. Для бяспекі тэрыторыю, дзе быў выяўлены боепрыпас, аператыўна перакрылі.

Паводле ацэнкі спецыялістаў, знаходкай з'яўляецца артылерыйскі снарад калібрам 115 мм, які адносіцца да арсенала часоў Вялікай Айчыннай вайны. Боепрыпас быў знішчаны.

### PHOTOSHOP «КІРОЎЦУ» Ў ДАПАМОГУ

**Падчас нясення службы супрацоўнікамі АДАІ Ленінскага РУУС сталіцы быў спынены аўтамабіль для праверкі дакументаў. За рулём знаходзіўся 22-гадовы замежны грамадзянін, які ехаў на арандаваным таварышам аўтамабілі.**

Пры праверцы дакументаў даішнікі выявілі відавочныя знешнія прыкметы падробкі. Пры апытанні хлопец растлумачыў, што пасведчанне кіроўцы чатыры гады таму зрабіў з дапамогай праграмы Photoshop.

Канфіскаванае вадзіцельскае пасведчанне было накіравана на экспертызу, падчас якой эксперты далі заключэнне аб прыкметах падробкі дакумента.

Следчыя далі прававую ацэнку дзеянням замежніка і распачалі крымінальную справу за падробку дакументаў. Вядома, што раней мужчына да крымінальнай адказнасці не прыцягваўся.

### ВЫРВАЎ КАШАЛЁК З-ПАД АДЗЕННЯ

**Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Мінскага РУУС па гарачых слядах раскрылі рабаванне, здзейсненае ў дачыненні да 81-гадовай пенсіянеркі з Мінскага раёна.**

Пацярпелая патлумачыла, што здавала пакой маладому чалавеку на працягу месяца. Пенсіянерка толькі ведала імя свайго кватаранта, паведамляе Мінскае РАУС.

Паводле яе слоў, у адзін з дзён ён прыйшоў у стане алкагольнага ап'янення, збіў яе, вырваў кашалёк з-пад адзення і выкраў 200 рублёў, пасля чаго знік у невядомым напрамку.

У ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікамі крымінальнага вышуку быў устаноўлены падазраваны ў здзяйсненні злачынства: 41-гадовы ўраджэнец Мінскай вобласці, нідзе не працуе, раней неаднаразова быў судзімы за бытавыя злачынствы.

У дачыненні да яго заведзена крымінальная справа па артыкуле «Рабаванне». Мужчыну пагражае да шасці гадоў пазбаўлення волі.

### АШУКАНСКІ СЯМЕЙНЫ ПАДРАД

**Супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Савецкага РУУС сталіцы праведзена праверка ў дачыненні да мужа і жонкі, якія аказвалі паслугі арэнды будаўнічай тэхнікі.**

Паводле інфармацыі МУС, 50-гадовая прадпрымальніца сумесна са сваім 52-гадовым мужам здавалі будтэхніку ў арэнду арганізацыі, якая выконвала падрадныя работы ў Дзяржынскім раёне за кошт бюджэтных сродкаў. У ходзе аказання паслуг муж і жонка ўносілі ў дарожныя лісты і акты выкананых работ завышаныя даныя ў частцы часу эксплуатацыі тэхнікі, а ў наступным падавалі арганізацыі падробленую дакументацыю для далейшай аплаты.

Такім чынам, з сакавіка да мая 2020 года праз махлярства яны прысвоілі сабе больш за 7000 рублёў.

Следчыя далі прававую ацэнку дзеянням падазраваных і распачалі крымінальную справу па факце махлярства, здзейсненага групай асоб у буйным памеры.

### ДА НАЙБЛІЖЭЙШАГА СЛУПА...

**39-гадовы жыхар Навагрудка ўжываў алкаголь. Позна ўвечары ён вяртаўся дадому і прыкмеціў аўтамабіль Opel Vectra. Кіроўца транспартнага сродку па няўважлівасці пакінуў ключы ў замку запальвання.**

Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама, грамадзянін вырашыў скарыстацца абставінамі. Ён сеў у транспартны сродак, завёў яго і адправіўся калясіць па вуліцах горада. Аднак не справіўся з кіраваннем і на гэтай жа вуліцы здзейсніў ДТЗ, пасля чаго збег з месца здарэння.

Праз некаторы час пацярпелы выявіў прапажу аўтамабіля і звярнуўся па дапамогу ў праваахоўныя органы. У ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў асоба падазраванага была ўстаноўлена. Раней ён неаднаразова прыцягваўся да крымінальнай адказнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШКОЛА З ВОКНАМІ Ў ЗАЎТРА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Роднае месца

Ужо з парога адчуваецца цеплыня роднага слова. Уся інфармацыя, у тым ліку афіцыяльная і азнаямленчая, на беларускай мове. Над дзвярыма — прымаўкі і прыказкі, падзякі і прывітанні. На ўваходзе ў сталовую, напрыклад, вісіць шыльда з надпісам «Шчыра вітаем», а ў самой зале — «Смачна есці». Бацькі ўслед за дзяцьмі паўтараюць гэтыя словы і пакрысе ўлюбляюцца ў родную мову. Нават не беларусы. Знаёмлюся з Армінe Асян, якая якраз прывяла ў садок двух сваіх пяцігадовых дачушак-двайнятак Аліну і Арыяну. Тут жа вучыцца яе сын-сямікласнік Армен. Сям'я жыла ў Мінску, але лёс прывёў жанчыну з дзецьмі сюды, да бацькоў, якія пераехалі ў Завадскую Слабаду 20 гадоў таму.

— Для мяне гэта роднае месца, і я нікуды адсюль не хачу ехаць, — кажа яна. — Тут усё для мяне блізкае. Мой малодшы брат вучыўся ў гэтай школе. Школа вельмі добрая, настаўнікі — таксама. Адносіны да дзяцей цёплыя. І сыну тут нават больш камфортна, чым у сталічных умовах. Тое, што ўсе прадметы на беларускай мове, нават да лепшага. І даецца яна яму лёгка. Тут і людзі больш добразычлівыя, настаўнікі пастаянна дапамагаюць.

**Дырэктар установы Ірына СЫРАМАЛОТАВА** праводзіць экскурсію па школе і паказвае дасягненні навучэнцаў. Тое, што гэта творчыя асобы, можна не сумнявацца. Дастаткова наведаць фотазону, дзе шмат розных цікавых фішак, зробленых пры ўдзеле






дзяцей. Упрыгожвае куток дрэва пажаданняў, дзе школьнікі выказваюць свае прызнанні ў любові да краіны. Яны зрабілі яго ў рамках акцыі «Люблю цябе, Беларусь». Летась за поспехі ў шматлікіх конкурсах раённы аддзел і абласное галоўнае ўпраўленне адукацыі падарылі школе мультыборд. Цяпер тут, у фотазоне, праводзяць і «Школу актыўнага грамадзяніна», пры жаданні можна падключыць і інтэрнэт.

— Гэтую ўстанову будавалі на перспектыву, агульная ўмяшчальнасць 320 чалавек, — расказвае дырэктар. — Цяпер тут 77 вучняў і 27 выхаванцаў дзіцячага садка. Садок існуе з 2004 года. Нашы настаўнікі, сапраўды, як у рамане Якуба Коласа «На ростанях», усе як адзін адданыя справе ўсёй душой. Восем чалавек прыязджаюць з Магілёва, дванаццаць — мясцовыя жыхары. Сярэдні ўзрост — 45—47 гадоў, вакансій амаль няма. Мая намесніца пайшла ў дэкрэт, і трэба на час яе адсутнасці знайсці чалавека.

У школе спадзяюцца, што колькасць дзяцей будзе павялічвацца. Пасля таго як мясцовы саўгас «Барок» аб'ядналі з філіялам прадпрыемства «Магілёўэнерга» «Вендараж», з'явіліся перспектывы. Гаспадарка пашыраецца, плануецца будаўніцтва дамоў. Так што ёсць надзея, што сюды прыедуць новыя сем'і.




## Сто гадоў практыкі

Школу называюць хонаўскай, хоць яна знаходзіцца ў аграгарадку Завадская Слабада. І гэта пры тым, што існуюць вёскі і Малое Хонава, і Вялікае Хонава.

— Раней яна і размяшчалася ў вёсцы Малое Хонава, а пазней яе перанеслі сюды — у Завадскую Слабаду, — усміхаецца Ірына Міхайлаўна. — Назву вырашылі не мяняць, таму што нашай школе ўжо болей чым 100 гадоў. І нават зрабілі музей, каб усіх знаёміць з традыцыямі і гісторыяй.

Экспанатаў шмат, іх пачалі збіраць вельмі даўно. Ірына Сырамалотава прыйшла сюды ў 2014 годзе, калі музей быў у заняпадзе. І вырашыла яго аднавіць. Кожная музейная рэч тут з гісторыяй. Дзякуй захопленаму сваёй справай былому кіраўніку музея Уладзіміру Ласькову. Ён кіраваў музеем у Дасовіцкай школе, а калі яе закрылі, частка экспанатаў трапіла сюды.

— Вось гэта люстэрка са спаленай хаты з вёскі Рэпішча, — паказвае дырэктар школы экспанат у драўлянай аправе. — Гэта адзіная рэч, якая захавалася падчас пажару. Люстэрка перадалі Уладзіміру Ласькову. Бытуе меркаванне, што люстэркі забіраць нельга, каб не перанесці энергетыку другога жытла, але гэта для нас шчаслівае.

А вось вясельная ікона, — Ірына Міхайлаўна звяртае ўвагу на рарытэт. — Усе ёй цікавяцца. На ікону Казанскай Божай Маці накладзены самаробны вясельны вяночак. Абраз таксама з Рэпішча.

На стале ляжыць вялікі фаліянт — кніга славы з імёнамі ветэранаў, якія працавалі ў гаспадарцы і школе. А вунь і жорны. На іх нават сёння можна намалоць мяшочак мукі.

Пад столлю вісіць драўляная люлька. Тутэйшыя дзеці ведаюць, што і калыску, і крук, на які яна падвешана, павінен быў рабіць бацька. Ён жа — гаспадар сям'і!

За перагародкай — экспанаты, звязаныя з Афганістанам і ваенным часам. Экскурсіі, дарэчы, праводзяць навучэнцы. Уражвае прафесійны падыход у афармленні вітрын. Вітражныя тумбы і пакрыццё для падлогі школе дапамог купіць філіял «Сервалюкс Агра» СЗАТ «Сервалюкс», якім кіруе Васіль Мазурык. А ўжо выставачныя тумбы школа набыла з дапамогай бацькоў.

Музей папаўняецца і сучаснымі прадметамі, так званай школьнай дзейнасці. Гэта распрацоўкі грамадзянска-патрыятычнага праекта, якія атрымаў высокую адзнаку




на абласным і рэспубліканскім узроўнях. Тутэйшыя школьнікі распрацавалі фірменны нататнік і нават дызайн абгорткі для шакаладу.

## Школа з творчым характарам

— Мы пяць гадоў запар з'яўляемся пераможцамі сярод вучэбна-педагагічных комплексаў Магілёўскага раёна, — ганарыцца сваёй установай, калектывам і вучнямі дырэктар школы. — Нашы дзеці займаюць месцы і на рэспубліканскіх спаборніцтвах творчага характару. Мы два гады запар — пераможцы конкурсу сярод аздараўленчых лагераў адпачынку і ў вобласці, і на рэспубліканскім узроўні. Сёлета ў міжнародным конкурсе «Мы разам» наша навучэнка Ульяна Пускова заняла трэцяе месца са сваім фільмам «Мы розныя, мы разам». Нашы дзеці дэманструюць добрыя вынікі ў спартыўных спаборніцтвах. Мы лідары па настольным тэнісе, лыжных гонках, валейболе. Шмат нашых конкурсных работ займаюць першыя месцы на абласным і рэспубліканскім узроўнях. Праект па грамадзянска-патрыятычным выхаванні сёлета лідзіраваў на абласным узроўні, а на рэспубліканскім этапе атрымаў заахвочвальную грамату.

Суразмоўца дастае фаліянт з надпісам «Скарбонка грамадзянска-патрыятычнага выхавання». І гэта толькі апісанне! Колькі тут усяго — інтэрактыўныя гульні, квэсты, ток-шоу, пазначаныя QR-кодамі, каб ацаніць усё ў разгорнутым выглядзе.

У школе шмат увагі ўдзяляецца менавіта грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню. Шырока святкуюцца Масленіца, народныя і дзяржаўныя святы. На Дзень абаронцаў Айчыны, напрыклад, ладзіцца конкурс строю і песні.

— Сёлета да нас завіталі прадстаўнікі ваеннай часці з Гальшчы, — расказвае Ірына Міхайлаўна. — Яны сказалі, што некаторыя іх навабранцы нават пасля першага года службы не ўмеюць рабіць тое, што нашы дзеці, і нават падарылі нам шмат вайсковай формы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**
*Магілёўскі раён.*

### ❍ У тэму

**Начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама Андрэй ЗАБЛОЦКІ:**

— Сёлета ў вобласці з'явіцца яшчэ адна сучасная школа — у Бабруйску на 1020 чалавек. Ва ўсіх астатніх праведзены планавыя рамонты. Глабальныя рамонты праходзілі ў рамках фінансавання Банкам рэканструкцыі і развіцця. У Магілёўскай вобласці гэта школа ў аграгарадку Аўсянка. І басейн там адрамантавалі. Школа стала як цукерка. Наогул, на рамонт школ было накіравана 8,5 мільёна рублёў. Да 20 жніўня ўсе сертыфікаты гатоўнасці ўстаноў сярэдняй агульнай адукацыі павінны быць падпісаны. Першага верасня 341 установа агульнай сярэдняй адукацыі прыме 114 тысяч вучняў, у тым ліку 12 тысяч першакласнікаў.

# НА КРАЙНІМ ПОЎДНІ

## Як беларусы збіраюцца забяспечыць там сваю пастаянную прысутнасць?

**«Работа палярнікаў у Антарктыдзе — рамесная, карпатлівая, фізічна цяжкая, і слабы там проста не выжыве», — кажа нязменны кіраўнік усіх беларускіх антарктычных экспедыцый Аляксей ГАЙДАШОЎ. Восенню гэтага года на лядовы кантынент адправіцца ўжо 14-я экспедыцыя беларускіх палярнікаў. З 1955-га да 1992 года, у часы Савецкага Саюза, больш як 100 беларусаў удзельнічала ў савецкіх антарктычных экспедыцыях, у тым ліку і Аляксей Гайдашоў. Айчынныя метэаролагі, біёлагі, геафізікі, лётчыкі, будаўнікі ўпісалі нямала яркіх старонак у гісторыю даследаванняў Паўднёвага полюса. Потым быў вялікі перапынак. А ў жніўні 2006 года па ініцыятыве НАН і пры падтрымцы Прэзідэнта краіны была зацверджана першая Дзяржаўная праграма «Маніторынг палярных раёнаў Зямлі і забеспячэнне дзейнасці беларускіх антарктычных і арктычных экспедыцый на 2006—2010 гады і на перыяд да 2015 года».**



Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

**Мерапрыемствы, прымеркаваныя да 15-годдзя ўдзелу Беларусі ў вывучэнні Антарктыкі, прайшлі ў Нацыянальнай акадэміі навук. Да ўрачыстасцяў далучыліся ўдзельнікі антарктычных экспедыцый розных гадоў, дэлегацыя «Расгідрамета» і Расійскай антарктычнай экспедыцыі Інстытута Арктыкі і Антарктыкі, супрацоўнікі арганізацый НАН, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў краіны, датычныя да антарктычнай тэматыкі, члены Міжведамаснай камісіі Рэспублікі Беларусь па пытаннях Антарктыкі і маладыя навукоўцы.**

### У СПАРТАНСКІХ УМОВАХ

«15 гадоў — гэта многа ці мала? — разважае Аляксей Гайдашоў. — Азіраючыся назад, мне здаецца, што ўсё было быццам бы ўчора. Калі ўпершыню прагучала прапанова зноў накіравацца ў Антарктыду, я не раздумваў, хоць вопыт удзелу ў антарктычных экспедыцыях зусім не азначае вопыт распрацоўкі дзяржаўных праграм. Тым не менш, мэтавая праграма была напісана і зацверджана...»

Менавіта з 2006 года і вядзецца адлік навейшай гісторыі палярных даследаванняў. У лістападзе гэтага года з Санкт-Пецярбурга ў складзе сезоннага атрада 52-й Расійскай антарктычнай экспедыцыі на станцыю «Маладзёжная» адправіліся два беларускія спецыялісты — Аляксей Гайдашоў (на той момант намеснік начальніка Рэспубліканскага гідраметэацэнтра) і Леанід Турышаў (намеснік дырэктара Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ). І ў тым жа 2006 годзе Беларусь далучылася да Дагавора аб Антарктыцы.

— Першыя сем-восем гадоў нам было вельмі цяжка, мы працавалі фактычна ў палявых умовах, — канстатуе Аляксей Гайдашоў. — І ўвесь наш энтузіязм быў накіраваны на тое, каб забяспечыць пастаянную прысутнасць беларусаў у Антарктыдзе. Мы не маглі сабе дазволіць узняць сцяг, перарэзаць стужку, сказаць прамову, што мы былі ў Антарктыцы, а праз месяц пра ўсё забыцца. Гэта быў грандыёзны нацыянальны праект...

Расійскі бок даў у бязвыплатнае карыстанне некалькі законсерваваных збудаванняў, якія захаваліся з часоў савецкіх антарктычных экспедыцый. Жыць і працаваць даводзілася ў даволі суровых умовах, на старой інфраструктуры. Умовы там былі спартанскія. Добра прыгрэць памяшканне не было магчымасці. Гатавалі на невялічкай газавай плітцы на дзве фаеркі...

А ў 2013 годзе ўрад, Нацыянальная акадэмія навук і Мінпрыроды па ўзгадненні з Мінфінам зацвердзілі план будаўніцтва Беларускай антарктычнай станцыі. Два гады распрацоўвалася дакументацыя, вяліся падрыхтоўчыя работы. І ў 2015—2016 гадах пачалося ўзвядзенне першай яе чаргі.



Фота Рэспубліканскага цэнтра палярных даследаванняў.

Лічба «13» аказалася для ўдзельнікаў апошняй Беларускай антарктычнай экспедыцыі вельмі ўдалай: фарміраванне першай чаргі інфраструктуры Беларускай антарктычнай станцыі завершана.

**Інжынер-механік Аляксей ЗАХВАТАЎ,** неаднаразовы ўдзельнік і прызёр этапаў спаборніцтваў для пазадарожных аўтамабіляў, майстар на ўсе рукі (і слесар, і зваршчык, і кіроўца), стаў удзельнікам адразу чатырох беларускіх антарктычных экспедыцый. Першая яго экспедыцыя на Паўднёвы полюс Зямлі прыпала якраз на сезон 2015—2016 гадоў. «Тады мы мыліся ў тазіку з дапамогай чайніка, на наступны год у нас ужо з'явіўся санітарна-гігіенічны блок. А цяпер на нашай станцыі ёсць і паўнацэнная душавая, і пральная машына, і тэлебачанне, і інтэрнэт. Станцыя расце і развіваецца», — канстатуе Аляксей.

Наконт кліматычных умоў у Антарктыдзе ён жартаўліва кажа: «Звычайнае надвор'е там — гэта «лёгкі» ветрык», які гайдае цяжкую тэхніку і спрабуе зрушыць з месца станцыю, хоць наша сезонная экспедыцыя і праходзіць падчас палярнага лета. А калі сур'ёзна, то надвор'е ў Антарктыдзе вельмі імкліва змяняецца. І калі з раніцы адносна цёпла і штыль, то праз гадзіну-дзве можа быць шторм, вецер 30-40 метраў у секунду, мяцеліца і амаль нулявая бачнасць. Увогуле, Антарктыда пастаянна адкрывае сябе з розных бакоў. У маю першую экспедыцыю мяне ўразілі вельмі моцны кантраст белага, сіняга і блакітнага колераў, цішыня, што літаральна звініць у галаве, і туманы, якія падчас адлігі шчыльна ахутваюць усе збудаванні. Наша станцыя — прыбярэжная, і мы можам бачыць, як нараджаецца айсберг — гэта дзіўная з'ява. Хоць там усё дзіўна і ўнікальна. Ці хачу я зноў трапіць у Антарктыку? Так, мяне клічуць, але сям'я з цяжкасцю мяне адпускае. Майму сыну ўсяго 9 гадоў. Таму я пакуль узяў невялікую паўзу, але кропку не стаўлю...»

### АДЧУЙЦЕ РОЗНІЦУ

13-я экспедыцыя, якая вярнулася дамоў у маі, завяршыла фарміраванне першай чаргі інфраструктуры Беларускай антарктычнай станцыі. Праверка ўсіх тэхналагічных сістэм прайшла паспяхова, прычым неаднаразова. Станцыя на дадзены момант падрыхтаваная да правядзення ў перспектыве зімовачных мерапрыемстваў. Яе інфраструктура ўключае модуль кіравання сувязі і навігацыі са службова-жылой секцыяй (там размешчаны метэаралагічнае бюро, навігацыйнае абсталяванне, апаратура для сувязі як па Антарктыдзе, так і з Вялікай зямлёй, авіяцыяй і марскімі суднамі). Другі аб'ект — васьмісекцыйны лабараторна-жылы модуль. У ім размяшчаюцца навуковыя лабараторыі, жылыя памяшканні, тэхналагічны модуль кантролю за электраэнергіяй, санітарна-гігіенічная секцыя з душавымі, пральнымі машынамі, секцыя-саўна з пакоем адпачынку, амбулаторыя-медпункт з сучасным кантрольна-дыягнастычным, фізіятэрапеўтычным абсталяваннем. І яшчэ адна секцыя — аперацыйна-хірургічны блок, уладкаваны па самых сучасных патрабаваннях медыцынскага абслугоўвання. Абсталяванне дазваляе ў выпадку неабходнасці праводзіць нават складаныя хірургічныя ўмяшанні.



«Ветэраны»-палярнікі. Удзельнікі савецкіх антарктычных экспедыцый.

У сезон 2020—2021 гадоў у рэжыме тэставай эксплуатацыі была паспяхова апрабавана новая сістэма спадарожнікавай сувязі сістэмы VISAT, якая дазваляе ажыццяўляць кругласутачны аператыўны абмен навуковай і службовай інфармацыяй, выкарыстоўваць інтэрнэт-каналы для аператыўнай тэлемедыцыны і правядзення анлайн-кансультацый па ўсіх напрамках дзейнасці Беларускай антарктычнай станцыі, перадаваць вялікія аб'ёмы фота- і відэаінфармацыі. Акрамя таго, ва ўсіх членаў каманды было некалькі гадзін у канцы рабочага дня для стасункаў у месенджарах.

Аляксей Гайдашоў расказаў, што падчас 12-й экспедыцыі ў сезон 2019—2020 гадоў беларускую станцыю наведала міжнародная інспекцыя Дагавора аб Антарктыцы, якая вывучала пытанні бяспекі, экалогіі, энергазабеспячэння, водазабеспячэння, бяспекі транспартных сродкаў, сувязных камунікацый, арганізацыю навуковых даследаванняў. Праводзілася комплексная, непрадузятая і аб'ектыўная праверка. Па выніках не было ніводнага негатыўнага водгуку. Інспектары падкрэслілі высокую ступень экалагічнай бяспекі станцыі, яе тэхналагічнасць, шырокае выкарыстанне альтэрнатыўных крыніц энергіі, аснашчэнне энергаэфектыўным абсталяваннем. Вельмі высокія водгукі атрымаў і навуковы складнік: прыборная база, комплексы, тыя віды навуковых праграм і назіранняў, якія рэалізоўваюцца Беларускай антарктычнай экспедыцыяй. Па заключэнні інспектараў, на станцыі працуе вельмі кваліфікаваны персанал, пануе ўзорная дысцыпліна.

Дарэчы, упершыню ў складзе апошняй 13-й экспедыцыі ўдзельнічаў спецыяліст па арганізацыі харчавання. «Як кажуць у рэкламе, адчуйце розніцу ў параўнанні з тым, калі мы дзяжурылі на кухні па чарзе, — усміхаецца Аляксей Гайдашоў. — Па-першае, у нас цяпер было больш часу для выканання запланаваных работ плюс рэгулярнае, разнастайнае і здаровае харчаванне. А час ад часу нас чакалі нават кулінарныя сюрпрызы. Да таго ж упершыню некаторыя ўдзельнікі экспедыцыі прыбавілі ў вазе».

### АМБІЦЫЙНЫЯ ПЛАНЫ

Як падкрэсліў у сваім выступленні перад навуковай грамадскасцю **старшыня Прэзідыума НАН Беларусі акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ,** Беларусь сёння валодае фінансавымі, навукова-тэхнічнымі магчымасцямі і кадравым патэнцыялам для далейшага развіцця антарктычных і арктычных даследаванняў.

— За апошнія гады павялічыўся круг задач, што вырашаюцца ў рамках дзяржаўных праграм, узрасла колькасць удзельнікаў экспедыцый, пашырылася іх лагістыка. Варта адзначыць неацэнную дапамогу Расійскай Федэрацыі на ўсіх этапах станаўлення беларускай антарктычнай праграмы: ад планавання і правядзення навуковых даследаванняў да лагістыкі і рэалізацыі міжнародных працэдур. Падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж урадамі Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь у 2013 годзе і стварэнне рабочай групы па рэалізацыі пагаднення зрабіла нашу навуковую кааперацыю вельмі эфектыўнай.

Беларускімі навукоўцамі ўжо шмат зроблена, але, безумоўна, трэба будзе зрабіць яшчэ больш. У першую чаргу — палепшыць аснашчанасць стацыянарнай антарктычнай станцыі і сезонных экспедыцый навуковымі прыборамі і абсталяваннем. Нам належыць стварыць больш шырокі кадравы рэзерв навукоўцаў і спецыялістаў палярнага профілю, паколькі пераход да круглагадовых экспедыцый запатрабуе фарміравання шматлікай каманды даследчыкаў і спецыялістаў, дзе спалучацца вопыт і маладосці дасць магчымасць вырашыць пастаўленыя перад экспедыцыяй задачы, — упэўнены Уладзімір Гусакоў.

> Актыўная навуковая і экспедыцыйная дзейнасць у Антарктыцы далі падставу падаць заяўку аб прадастаўленні Беларусі статусу кансультатыўнага боку Дагавора аб Антарктыцы. Дадзенае пытанне плануецца разгледзець на пасяджэнні 54-й сесіі кансультацыйнай нарады Дагавора па Антарктыцы ў 2022 годзе ў Берліне.

Створаная інфраструктура каля гары Вячэрняя дазваляе планаваць у найбліжэйшыя гады пашырэнне навуковай дзейнасці і пераход Беларускай антарктычнай станцыі ў рэжым круглагадовай работы, у тым ліку з прыцягненнем замежных навукоўцаў. «Гэта значна больш эфектыўна з навуковага пункту гледжання і эканамічна больш выгадна, чым два разы на год адпраўляць экспедыцыю. Да таго ж круглагадовыя назіранні больш каштоўныя, бо дазваляюць ахапіць усе перыяды развіцця прыродных кампанентаў, усе змены, што адбываюцца, — падкрэслівае Аляксей Гайдашоў. — У нас ёсць кадры, жаданне, воля і стратэгічнае мысленне. І мы глядзім не пад ногі, а на перспектыву».

**Начальнік Расійскай антарктычнай экспедыцыі Інстытута Арктыкі і Антарктыкі Аляксандр КЛЕПІКАЎ** заўважыў, што вучоныя Саюзнай дзяржавы многія гады паспяхова супрацоўнічаюць у сферы палярных даследаванняў. «Вось ужо 15 гадоў беларусы рэалізоўваюць сваю антарктычную праграму ў цесным супрацоўніцтве з Расійскай антарктычнай экспедыцыяй», — сказаў ён, даўшы высокую ацэнку дзейнасці беларускіх вучоных за мінулыя гады.

— Усё, чаго мы дасягнулі ў Антарктыдзе, было зроблена не толькі непасрэднымі ўдзельнікамі экспедыцый, — падкрэслівае Аляксей Гайдашоў. — На агульны поспех працуе вялікая каманда Нацыянальнай акадэміі навук, пачынаючы ад адміністрацыі, бухгалтараў, юрыстаў-міжнароднікаў да транспартных падраздзяленняў, плюс каля дзясятка ведамстваў, уключаных у дзяржаўную праграму.

Дарэчы, для таго каб канчаткова замацавацца на ледзяным кантыненце, толькі мець сваю палярную станцыю там ужо недастаткова. З боку міжнародных арганізацый узрастаюць патрабаванні да навуковых вынікаў, атрыманых падчас экспедыцый. Прычым патрабуюцца публікацыі ў сур'ёзных міжнародных выданнях.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Информация о проведении аукциона 20 сентября 2021 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в аг. Барсуки, дер. Яловица Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области.

Организатор аукциона: Жодинский сельский исполнительный комитет, 222161, г. Жодино, пер. Молодежный, д. 3

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **аг. Барсуки** | 624881701101000473 | 0,0968 га | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 16 000,00 |
| 2 | **дер. Яловица** | 624881705601000178 | 0,0911га | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 9 000,00 |

**Аукцион состоится 20 сентября 2021 г. в 11.00 в Жодинском сельском и исполнительном комитете по адресу: г. Жодино, пер. Молодежный, д. 3, кабинет № 1.**

Извещение о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by,** Смолевичского райисполкома: **http://www.smolevichi.gov.by.**

УНП 600023532

## ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов по продаже имущества ОАО «Дятловоремстрой» (УНП 500056186), объявляет о проведении 21.09.2021 г. в 09.00 публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке:**
https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/08/spisok-imushhestva-oao-dyatlovoremstroj-na-torgi-21.09.21.pdf

Местонахождение имущества: г. Дятлово, ул. Советская, д. 73.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОАО «Дятловоремстрой», тел. +375293923903.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **20.09.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 20.08.21** по **17.00 20.09.21** на bankrottorg.by. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения.
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

**4.00** «Пад знакам задыяка. Дзева» (12+).

### EuroSport 1

**0.30, 2.30, 9.30, 14.00, 15.50** Веласпорт. «Вуэльта».
**1.30, 2.00** Тэлечасопіс «Жывыя легенды».
**4.00, 8.00, 12.30, 19.30** Тэніс. Australian Open. Жанчыны.
**5.30, 11.00** Конны спорт. Global Champions Tour. Валкенсвард. Канкур.
**7.00** Тэлечасопіс «Зала славы». Токіа-2020.
**18.45** Снукер. British Open. Фінал.
**21.00** Аўтагонкі на вынослівасць. «24 гадзіны Ле-Мана».
**22.00** Кузаўныя аўтагонкі. Кубак свету.
**22.30** ETCR. Кубак свету.
**23.00** Тэніс. Australian Open. Мужчыны. Фінал.

### Кінакамедыя

**0.40** «Хатабыч» (16+).
**3.15** «Нягледзячы ні на што» (16+).
**5.20** «Старая добрая оргія» (16+).
**7.05** «Дзеці сексу не перашкода» (16+).
**9.05** «Ібіца» (16+).
**10.40** «Дзень сурка» (12+).
**12.35** «Вельмі дрэнная настаўніца» (18+).
**14.15** «Паліцэйскі з Рублёўкі. Навагодняе бязмежжа» (16+).
**15.50** «Ты ўмееш захоўваць сакрэты?» (16+)
**17.35** «Сябраваць па-руску!» (18+).
**19.30** «50 першых пацалункаў» (16+).
**21.20** «Паслявясельны разгром» (18+).
**23.00** «Паляўнічыя на прывідаў» (6+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.00** «Чытальнік» (16+).
**9.05** «Улегцы» (12+).
**9.40** «Каралёк — птушачка пявучая». Серыял (16+).
**11.30** «Паралельны свет» (12+).
**12.30, 18.00, 3.35** «Сляпая» (16+).
**13.35, 19.10, 3.05** «Варажбітка» (16+).
**14.15** «Старац» (16+).
**14.55** «Суд ідзе» (16+).
**16.00** «Невядомы». Серыял (16+).
**20.20** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**23.15** «Чарнобыль. Зона адчужэння» (16+).
**0.20** «90-я» (16+).
**1.10** «Скiвіцы-2» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дакументальны серыял (16+).

### ТБ1000

**5.30, 6.10, 17.15, 18.05** «Доктар Хаус».
**7.15** «Блізкія кантакты трэцяй ступені».
**9.55** «Госця».
**12.10** «Рэальнае каханне».
**14.40** «Адпачынак па абмене».
**19.00** «Тарзан. Легенда».
**21.00** «Скарб Амазонкі».
**22.55** «Маёр Пэйн».
**0.40** «Еш, маліся, кахай».
**3.00** «Рэальнае каханне».

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.40** «9 рота» (16+).
**8.05** «Шчасце ў канверце» (12+).
**9.55, 4.05** «Адмірал» (16+).
**12.10** «Іронія лёсу. Працяг» (12+).
**14.10** «Гараскоп на ўдачу» (12+).
**15.55, 17.00, 18.00, 19.00** «Нюхач» (16+).
**20.00** «Хатабыч» (16+).
**21.45** «Нерэальнае каханне» (12+).
**23.15** «Мужчына з гарантыяй» (16+).
**0.50** «Любі іх усіх» (18+).
**2.30** «Гудбай, Амерыка» (12+).

### National Geographic

**6.00** Як перамагаць ва ўсім (16+).
**6.25** Гульні розуму (16+).
**7.15** Асушыць акіян: глыбокае апусканне (16+).
**8.05** Ледзяная дарога (16+).
**8.55** Востраў бунтароў (16+).
**9.45** Мегазаводы (16+).
**10.40, 4.20** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**11.35** Дзікі тунец (16+).
**12.30, 16.45** Неразгаданыя таямніцы Сонца (16+).
**13.15** Сапраўдны геній са Стывенам Хокінгам (16+).
**14.10** Морган Фрыман (16+).
**15.05** Індыя з вышыні птушынага палёту (16+).
**15.55** Турэмныя цяжкасці (16+).
**17.35** Служба бяспекі аэрапорта: першы клас (16+).
**18.25** Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
**19.15** Расследаванні авіякатастроф: спецыяльны выпуск (16+).
**20.10** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**21.00, 21.50, 2.45** Наркавойны (16+).
**22.40** Аўта — SOS (16+).
**23.35** Аўта — SOS (16+).
**0.25** Інстынкт выжывання (16+).
**1.10** Тэхаскі ўлоў (16+).
**1.55** Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).
**3.35** Асушыць акіян (16+).
**5.15, 5.35** Навуковыя глупствы (16+).

### Discovery

**8.00, 17.42** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**8.46, 11.25, 12.18, 14.06, 15.00, 15.54, 16.48, 22.12** Махінатары (12+).
**9.39, 10.06, 20.24, 20.51** Паляўнічыя на рэлiквіі (16+).
**10.32, 10.59, 21.18, 21.45** Як гэта ўладкавана? (12+)
**13.12** Хуткасць — хіт сезона (12+).
**18.36, 19.03** Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
**19.30, 4.15** Хуткія і гучныя (12+).
**23.06, 5.45** Джэф Бэзас на мяжы космасу.
**0.00, 6.30** У пошуках Атлантыды (12+).
**0.54, 7.15** Несакрэтныя матэрыялы (16+).
**1.47, 2.40, 3.30** Дзікія эксперыменты Адама Сэвіджа (12+).
**5.00, 5.23** Як гэта зроблена? (16+)

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

# У ТРЭНДЗЕ — СЦЕНЫ З ГІСТОРЫЯЙ

**Сёлета ў Віцебскай вобласці вельмі добра ідуць з малатка будынкі, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць. Дарэчы, за апошнія дзесяць гадоў па выніках аўкцыёнаў рэалізавалі каля дваццаці пяці такіх аб'ектаў нерухомасці. Агульная цана прададзенага — больш чым чатыры мільёны рублёў. Рэалізацыя задач па аптымальным выкарыстанні метраў традыцыйна ў цэнтры ўвагі абласнога і раённых парламентаў.**

І сёлета прасочваецца тэндэнцыя папулярнасці будынкаў з гісторыяй.

У прыватнасці, у былой сядзібе А. А. Рымскага-Корсакава ў Полацкім раёне ў вёсцы Бяздзедавічы, якую прадалі на аўкцыёне, адкрыюць хоспіс. А раней у гэтых сценах, пабудаваных у пачатку XX стагоддзя, сваяком вядомага кампазітара, функцыянавала бальніца сястрынскага догляду. Сядзіба выстаўлялася на аўкцыён ужо пяты раз, чаргова — пры стартавай цане за базавую велічыню. За перамогу на аўкцыёне змагаліся два пакупнікі. І ў выніку сядзіба была прададзена прыкладна за 5,4 тысячы рублёў навапалацкаму індывідуальнаму прадпрымальніку.

Пра гэта паведамілі карэспандэнту «МС» у камітэце «Віцебскаблмаёмасць». І дадалі, што на мінулым тыдні на аўкцыёне прадалі яшчэ адзін будынак далёкага мінулага.






**Сцены былой сядзібы А. А. Рымскага-Корсакава ў Полацкім раёне.**

Гаспадар з'явіўся ў сядзібнага дома ў вёсцы Асада Дзедзіна Мёрскага раёна. Яго тройчы выстаўлялі на продаж за базавую велічыню (пачынаючы з 2010 года). Новы ўладальнік двухпавярховага, цаглянага будынка агульнай плошчай 772,6 квадратнага метра, пабудаванага ў XIX стагоддзі, абавязваецца падпісаць ахоўнае абавязацельства і выкарыстоўваць комплекс пад стварэнне аб'ектаў сацыяльнага, культурна-асветніцкага прызначэння або сэрвісу. Цяпер пра гэта «рэха архітэктуры мінулага» будуць клапаціцца не горш, а мо і ў разы лепш, чым у дарэвалюцыйны час.

Для тых, хто ўкладвае грошы ў рэалізацыю інвестыцыйнага праекта, з боку дзяржавы прадстаўляюцца розныя прэферэнцыі. У ліку іншых можна сэканоміць у выніку вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць, увазных мытных пошлін, не трэба аплачваць зямельны падатак.

Вялікі бонус і ў тым, што пасля ўзгаднення на ўзроўні кіраўніка ўлады краіны інвестары могуць атрымаць індывідуальныя льготы. Гэта прадугледжваецца Дэкрэтам № 10 «Аб стварэнні дадатковых умоў для ажыццяўлення інвестыцый у Рэспубліцы Беларусь» (ад 6 жніўня 2009 года).

Усяго, па апошняй інфармацыі, сёлета камітэтам «Віцебскаблмаёмасць» праведзена ўжо больш за шэсцьдзясят пяць выніковых аўкцыёнаў, на якіх было прададзена каля сямідзесяці аб'ектаў на агульную суму больш за 1,9 мільёна рублёў.

Днямі ў Паставах адбылося пасяджэнне камісіі па ўключэнні ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца і неэфектыўна выкарыстоўваецца, якая знаходзіцца ва ўласнасці Віцебскай вобласці і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. У гэтым раёне напрацавалі добры вопыт у тым, каб на эканоміку актыўна «працавалі метры», у тым ліку шмат збудаванняў, якія засталіся ў спадчыну ад савецкай арміі. Прадстаўнікі мясцовай улады паказалі, як цяпер выкарыстоўваецца доўгі час непатрэбнае. Спікеры з розных раёнаў агучылі вопыт. У бягучай пяцігодцы работу актывізуюць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

ЭКАЛОГІЯ

# «Чужы» здае пазіцыі

**Сярод галоўных вектараў у рэалізацыі абласной праграмы добраўпарадкавання, зацверджанай Саветам дэпутатаў Прыдзвінскага краю, — знішчэнне баршчэўніку Сасноўскага. Сёлета на поўначы Беларусі, у якой больш чым у іншых абласцях агульная плошча баршчэўніку, адпаведны план барацьбы перавыкананы на пяць працэнтаў.**

Работы ажыццяўлялі на плошчы па радку 3,7 тысячы гектараў. На выкананне комплексу мерапрыемстваў выдаткавалі больш за 1,2 мільёна рублёў.

Паводле слоў **старшыні абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віктара ГАЛАНАВА,** пасля канчатковай перамогі над «зялёным ворагам» стала магчымым выкарыстанне пад дзвесце гектараў зямель. Іх перааралі і там засеялі травасумесі.

Навукоўцы даказалі, што самы эфектыўны спосаб знішчэння інвазіўнай расліны — хімічны метад з выкарыстаннем спецыяльных хімічных рэчываў (гербіцыдаў), якія выклікаюць гібель. Сёлета такім чынам апрацавалі прыблізна 3,1 тысячы гектараў, механічным — каля 395 га.



Дзяржаўныя эколагі канстатуюць, што мясцовая ўлада больш адказна стала каардынаваць намаганні ў барацьбе з небяспечным прадстаўніком флоры.

Ёсць і чэмпіён, па-за канкурэнцыі: у Чашніцкім раёне ў выніку правільнага комплекснага правядзення работ усе месцы дыслакацыі баршчэўніку Сасноўскага былі знішчаны яшчэ летась. Самымі праблемнымі з'яўляюцца Ушацкі, Віцебскі і Гарадоцкі раёны.

Акрамя вайны з баршчэўнікам, праблем яшчэ нямала.

Каля шасцідзесяці службовых асоб прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці за невыкананне прадпісанняў аб ліквідацыі недахопаў, якія былі выяўлены падчас маніторынгу за выкананнем эфектыўнасці рэалізацыі супрацьбаршчэўнікавых мер. Паводле інфармацыі згаданага вышэй камітэта, вінаватыя заплацілі штрафы на агульную суму больш за 7 тысяч рублёў.

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ,** калі на сесіях абласнога парламента абмяркоўваецца тэма добраўпарадкавання, асаблівую ўвагу ўдзяляе пытанню знішчэння баршчэўніку. Раіць пераймаць вопыт з выездам на месцы.

Вельмі добры вопыт напрацаваны супрацоўнікамі МНС. Гэтыя людзі ў форме, безумоўна, самыя ідэальныя знішчальнікі шкоднага зялёнага: служаць у кожным раёне, маюць адпаведную экіпіроўку, аказваюць адпаведныя платныя паслугі па самых прымальных расцэнках. Супрацоўніцтва з імі дазваляе эканоміць час і грошы. Віцебскае абласное ўпраўленне МНС стала адзіным дзяржаўным выканаўцам работ па заказе землекарыстальнікаў.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ** лічыць, што ў бягучай пяцігодцы ў Прыдзвінні магчыма канчаткова вырашыць пытанне знішчэння баршчэўніку. Тым больш што яшчэ не выкарыстоўваюцца ўсе рэзервы. Сёлета вельмі актыўна падключыліся да вайны з баршчэўнікам дарожнікі. Напрыклад, кіраўніцтва абласной улады адзначае добры ўклад прадпрыемстваў, якія займаюцца меліярацыяй.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# СПАЧАТКУ ТРЭБА ДОБРА ПАДУМАЦЬ

**Учора старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ правёў асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб.**

Пераважная большасць зваротаў, з якімі да сенатара прыехалі наведвальнікі з розных куткоў краіны, у той ці іншай ступені датычылася спрэчных маёмасных пытанняў, якія, па версіі аўтараў зваротаў, мясцовыя ўлады з шэрагу прычын не хочуць вырашаць, не ідуць насустрач пакрыўджаным землякам. А тыя ў пошуку праўды вымушаныя грукаць у дзверы начальнікаў, пісаць скаргі, наймаць адвакатаў.

Шчыра кажучы, было сумна і часам цяжка глядзець на гэтых людзей, з тугой у вачах і поўнымі папкамі папер з адказамі ад раённых арганізацый і органаў улады, абласных і рэспубліканскіх інстанцый, судоў. Напрыклад, нялёгка было слухаць Ганну Аляксандраўну з Ваўкавыска. Яна з уласнай дабрыні некалі прапісала на сваёй жылплошчы двух сыноў стрыечнай сястры, якія з часам, паводле яе слоў, не без махлярства ўгаварылі маладасведчаную пажылую жанчыну падпісаць ім акт дарэння яе кватэры. У выніку жанчына апынулася без жылля. Вось і звярнулася па дапамогу ў Савет Рэспублікі.

Сяргей Сівец пастараўся па меры магчымасці ўнікнуць у абставіны гэтай няпростай гісторыі і даў рэкамендацыі, парады наконт таго (вядома ж, пры ўмове праўдзівага выкладання жанчынай ходу падзей вакол яе кватэры), як і куды трэба звярнуцца па аднаўленне справядлівасці.

З не менш заблытанай справай па зямельным пытанні звярнулася да сенатара і гаспадыня «доміка ў вёсцы» ў Карэліцкім раёне Ларыса Барысаўна. Нібыта пасля набыцця дома за яе сям'ёй па ўсіх атрыманых дакументах лічыўся адзін зямельны ўчастак з пабудовамі, але потым нейкім чынам яго падзялілі на два. І другая палова ўжо не належыць Ларысе Барысаўне. Яна, зразумела, не сцярпела такую крыўду, стала шукаць праўду, і гэтыя пошукі прывялі яе ў Савет Рэспублікі.

У размове з журналістамі Сяргей Сівец адзначыў: супрацьстаць падобным непрыемным здарэнням можна і трэба шляхам павышэння прававой адукаванасці насельніцтва, бо жыллёвыя і зямельныя спрэчкі ўваходзяць у лік самых складаных у юрыдычнай практыцы. І сённяшні прыём грамадзян сведчыць аб тым, што пры заключэнні маёмасных здзелак неабходна вельмі ўважліва вывучаць усе дакументы, не саромецца пытаца і перапытваць.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# НА ЗНАКАВЫХ АБ'ЕКТАХ І МАЛЕНЬКІХ ЗАВУЛКАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

А 10 жніўня пачаўся доўгачаканы аўтамабілістамі рамонт на адным з самых інтэнсіўных і праблемных гарадскіх пуцеправодаў, які злучае вуліцы Скрыпнікава і Кіжаватага ў раёне чыгуначнага вакзала. У народзе за ім даўно замацавалася назва — Гарбаты мост. Спачатку дарожнікі прыступілі да рамонту бар'ернай агароджы — бетоннай і металічнай. Мост не закрывалі для руху, паток рэгулюецца часовымі святлафорамі. А пасля рамонту названы мост стане больш прыгожым і бяспечным.

Паводле інфармацыі **намесніка старшыні Брэсцкага гарвыканкама Андрэя ІЛЬЯШУКА,** тэмпы будаўніцтва жылля ў Брэсце апошнім часам не зніжаюцца. А пакольκі абласны цэнтр прырастае новымі жылымі кварталамі, то будуюцца і новыя дарогі для новых мікрараёнаў. Напрыклад, у мікрараёне ПЗМР-5, разлічаным на 10 тысяч жыхароў, фактычна завершана будаўніцтва дзвюх дарог — вуліцы ваенурача Барыса Маслава і вуліцы Мытная. Тут, дарэчы, размесціцца жылы комплекс «Белы горад», які, паводле задумкі архітэктараў, стане адной з візітак горада, дакладней, яго заходняй часткі.

Працягваецца добраўпарадкаванне на некаторых знакавых аб'ектах горада. Гаворка ідзе найперш пра рэканструкцыю і паляпшэнне Набярэжнай. Зараз будаўнікі шчыруюць на 4-й чарзе аб'екта, сёлета плануецца прыступіць і да 5-й чаргі, якая дазволіць забяспечыць пешаходную сувязь набярэжнай Мухаўца з выхадам да музея чыгуначнай тэхнікі. А гэта ўжо раён Брэсцкай крэпасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ДЭКРЭТ № 3

# Работа ёсць — было б жаданне

## Карэспандэнт «МС» пацікавілася, што перашкаджае знайсці працу на сяле

**Аграгарадок Завадская Слабада ў Магілёўскім раёне — месца даволі прывабнае. Прыгожы чысты населены пункт з усімі неабходнымі для жыцця сацыяльнымі аб'ектамі і паспяховай гаспадаркай — філіялам РУП «Магілёўэнерга» «Вендараж». Тут заўсёды патрэбны працоўныя рукі. Але некаторыя тутэйшыя жыхары не вельмі спяшаюцца працаўладкоўвацца. У аўторак лёс шасці з іх разглядалі на раённай камісіі па садзейнічанні занятасці. На жаль, чацвёра адразу ж адмовіліся, маўляў, за такую зарплату не жадаюць працаваць. Але двое паабяцалі прыйсці ў раённы цэнтр занятасці па накіраванне на работу.**

— У нас работа ёсць — было б жаданне, — кажа **старшыня Заводскаслабодскага сельвыканкама Ірына СЛАБКОВІЧ.** — У філіяле калгаса «Вендараж» заўсёды людзі патрэбны.

Усяго ў базе па сельсавеце 77 чалавек не занятых у працоўнай дзейнасці. Але гэта з улікам тых, хто прапісаны тут, а працуе ў Магілёве або наогул з'ехаў у Расію.

— Такіх у нас 21 чалавек, — удакладняе Ірына Слабковіч. — З імі ў нас больш за ўсё праблем. Яшчэ 30 прызнаныя занятымі гаспадарчай дзейнасцю. Яны трымаюць жывёлу, вырошчваюць сельгаспрадукцыю, займаюцца рамесніцтвам. Астатнія — дармаеды. Па законе яны абавязаны кампенсаваць дзяржаве выдаткі па камунальных паслугах — ацяпленні, вадзе і газе — у поўным памеры, але гэтыя людзі жывуць у сваіх дамах і цэнтралізаванымі камунальнымі паслугамі не карыстаюцца. Прыходзіцца пераконваць іх, што трэба працаваць. На камісіі запрашаем садзейнічаць занятасці, на СГПАП (савет грамадскага пункта аховы правапарадку) з удзелам участковага і прадстаўнікоў зацікаўленых службаў.




Фота аўтара.

Лейтэнант міліцыі Магілёўскага РАУС Алег Волчак — участковы Заводскаслабодскага сельсавета. Прызнаецца, што перыядычна прыходзіцца супакойваць аматараў гарэлкі. Тым разам ён забяспечвае яўку людзей на камісію, бо самастойна прыйсці не ўсе жадаюць.

— Я працую тут з сярэдзіны студзеня, але ўжо добра ведаю патэнцыйных парушальнікаў супакою, — удакладняе суразмоўца. — Асноўныя з іх — менавіта выпівохі. Яны парушаюць правілы паводзін у грамадскіх месцах, дэбашыраць у сем'ях.

Дарэчы, у гэты ж дзень атрымалася стаць сведкам, на жаль, дастаткова тыповай для сельскіх населеных пунктаў карціны. Два мужчыны з раніцы выпілі і адмовіліся ісці на работу. У сельсавет па дапамогу да ўчастковага прыбег начальнік участка аграгаспадаркі. Адзін з парушальнікаў — непаўналетні «сірата», маці якога — абавязаная асоба, пазбаўленая мацярынскіх правоў за сяброўства з «зялёным змеем», а другі — ... бацька чацвярых дзяцей. Кажуць, што шматдзетны бацька не дрэнны работнік, але «сірата» перыядычна яго збівае з правільнага шляху. Канфлікт больш-менш атрымалася ліквідаваць, але ўчастковы паабяцаў разабрацца з парушальнікамі, калі яны працверазяцца.

— Нядаўна на СГПАПе разглядалі, але высноў такія людзі не робяць, — выказвае прыкрасць участковы. — Раней у Адміністрацыйным кодэксе быў артыкул, па якім за з'яўленне на працоўным месцы ў нецвярозым стане прыцягвалі да адказнасці, але з першага сакавіка кодэкс змяніўся, і гэты артыкул прыбралі. Застаецца толькі і ўздзейнічаць словам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
*Магілёўскі раён.*

РЫНАК ПРАЦЫ

# А Ў ВІЦЕБСКУ ПАТРАБУЮЦЦА НАВАТ... МАТРОСЫ

**На поўначы краіны некаторым прадстаўнікам нават рабочых прафесій гатовыя плаціць міністэрскія заробкі. Ёсць і даволі экзатычныя вакансіі. Карэспандэнт «МС» вывучыў прапановы.**

## Пад заказ!

Сітуацыя на рынку працы Віцебшчыны, як і ў цэлым у краіне, традыцыйна стабільная.

**Намеснік кіраўніка Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама Аляксандр ХРЫСТАФОРАЎ** канстатуе, што выкананне дзяржаўнай праграмы «Рынак працы і садзейнічання занятасці» — адзін з галоўных прыярытэтаў. Пры гэтым, безумоўна, на высокім прафесійным узроўні трэба вырашаць усе пытанні і задачы раз-напланавай дзейнасці камітэта.

Сёлета пры садзейнічанні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне арганізавана навучанне каля 280 грамадзян. Найбольш запатрабаванымі былі прафесіі электраманцёра, кіроўцы пагрузчыка, слесара-сантэхніка, кухара, прадаўца, трактарыста.

Беспрацоўнымі таксама асвойвалася праграма курсаў «Асновы бізнес-планавання», пасля чаго прыкладна сорак чалавек — з ліку тых, хто прайшлі навучанне, — атрымалі бязвыплатную субсідыю на адкрыццё ўласнай справы.

А больш за семдзесят працэнтаў накіраваных на навучанне беспрацоўных навучаліся з гарантыяй працаўладкавання, у тым ліку прадаўцамі і кухарамі: у «ААТ»Віцебскмясамалпрам», ААТ «Ніка», ААТ «Вітміл», слесарамі-сантэхнікамі — у прадпрыемства камунальнікаў «ЖРЭТ г. Віцебска».

Цікава, што арганізавана навучанне трох чалавек, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў.

У цяперашні час фарміруецца група па накіраванні на навучанне па прафесіі «Майстар па манікюры, майстар па педыкюры» (навучанне будзе праходзіць у Віцебску).

## Зарабляць з юных гадоў

На асаблівым кантролі — часовая занятасць вучнёўскай моладзі. У Падзвінні папрацаваць у вольны ад вучобы час дапамаглі больш за 3,5 тысячы хлопцам і дзяўчатам — у рамках арганізацыі другаснай занятасці за кошт сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Амаль 88% працаўладкаваных — навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Прыярытэтнае права на часовае працаўладкаванне даецца моладзі з няпоўных, шматдзетных, малазабяспечаных сем'яў, падлеткам, якія стаяць на ўліку ў камісіях і інспекцыях па справах непаўналетніх.

Арганізатарамі часовай занятасці за кошт сродкаў фонду выступаюць установы адукацыі аддзелаў па адукацыі райгарвыканкамаў, сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і дамы-інтэрнаты вобласці.



Цеплаход «Віцебск».

У рамках часовай занятасці маладыя грамадзяне займаліся добраўпарадкаваннем і азеляненнем прышкольных тэрыторый, рамонтам школьнай мэблі і вучэбных памяшканняў, аднаўленнем бібліятэчных фондаў, шылі адзенне, рабілі сувеніры, стэнды і іншае.

> У Падзвінні папрацаваць у вольны ад вучобы час дапамаглі больш за 3,5 тысячы хлопцам і дзяўчатам... Амаль 88 % працаўладкаваных — навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Усяго ў рамках дзяржаўнай праграмы сёлета ў Віцебскай вобласці на арганізацыю часовай працоўнай занятасці моладзі летам і ў вольны ад вучобы час са сродкаў бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва выдзелена 1240 тысяч рублёў. Гэтыя грошы для аплаты працы не менш за чатырох тысяч школьнікаў і студэнтаў.

Акрамя таго, арганізавана магчымасць індывідуальнага працаўладкавання моладзі ў арганізацыі Віцебшчыны (за кошт уласных сродкаў наймальнікаў). У студзені—ліпені такім чынам працаўладкавана каля дзевяцісот маладых грамадзян.

## Гатовыя плаціць шмат!

Накont вакансій і зарплаты — выбар багаты. Ёсць і даволі нечаканыя прапановы. Напрыклад, камунальнае рамонтнае ўнітарнае прадпрыемства «Гардармост», якое займаецца кантролем за тэхнічным станам мастоў, дарожных пакрыццяў і тратуараў, добраўпарадкаваннем на тэрыторыі Віцебска, мае патрэбу ў... двух матросах. Справа ў тым, што на яго балансе два цеплаходы, якія катаюць пасажыраў па хвалях Заходняй Дзвіны: «Віцебск» і «Паўночная сталіца». Умяшчаюць гэтыя судны адпаведна пяцьдзясят і восемдзесят адпачываючых.

Зразумела, неабходныя людзі, каб забяспечваць добрае функцыянаванне, хай невялікай, але віцебскай флатыліі.

Ахвотным стаць матросамі абяцаюць заробак 600 рублёў у месяц, работу ў адну змену. Дарэчы, для абласнога цэнтра нядрэнная аплата працы. Для параўнання, слесару-сантэхніку пятага разраду на кандытарскай фабрыцы прапаноўваюць 550 рублёў.

А вось у ААТ «Віцебсклес» гатовы плаціць машыністу тралёвачнай (лесанарыхтоўчай) машыны 3000 рублёў! Дык хто забараняе вывучыцца на яго? Лянота? Рэкардсмен у Падзвінні па аплаце працы — аршанскае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Цыліндэрс-Бел», якое займаецца вытворчасцю бясшвовых стальных балонаў высокага ціску і сасудаў пад ціскам. Там кіраўніку з веданнем англійскай і чэшскай моў прапаноўваюць больш за 6,2 тысячы рублёў у месяц.

Калі артыкул рыхтаваўся да друку, з'явіўся новы рэкорд па прапанаваным заробку: 7 тысяч рублёў у Аршанскім раёне гатовы плаціць... дальнабойшчыку. Таму, напрад на курсы за адпаведным пасведчаннем!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота Алега КЛІМОВІЧА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНЫХ І ДЗЯРЖАЎНЫХ МЯСЦОВЫХ СЛУЖБАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 19 жніўня 2021 года.

# ЧЫМ ЗДЗІВЯЦЬ ЗІМОВЫЯ АЛІМПІЙСКІЯ ГУЛЬНІ Ў ПЕКІНЕ?

**Аб гэтым распавёў «Звяздзе» Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Се СЯАЮН**

## ГОРАД ДЗВЮХ АЛІМПІЯД

— Увечары 8 жніўня па мясцовым часе завяршыліся Алімпійскія гульні ў Токіа. Алімпійскія зборныя Кітая і Беларусі разам са спартсменамі іншых краін падтрымалі новы алімпійскі дух «хутчэй, вышэй, мацней, разам» і прадэманстравалі свету выдатныя спартыўныя вынікі, заваявалі ўзнагароды для сваёй Радзімы і свайго народа і ўнеслі новы ўклад у алімпійскі рух. Шчыра віншую ўсіх удзельнікаў алімпійскіх зборных Кітая і Беларусі, — адзначыў Се Сяаюн.

Летнія Алімпійскія гульні ў Токіа скончыліся, і мы набліжаемся да зімовых Алімпійскіх гульняў у Пекіне, які стане першым у свеце «горадам двух Алімпіяд», што прымаюць і летнія, і зімовыя Алімпійскія гульні, а таксама другой сталіцай, якая прыме зімовыя Алімпійскія гульні пасля праведзенай у 1952-м Алімпіяды ў сталіцы Нарвегіі Осла. Праз паўгода, у дзень пачатку вясны па традыцыйным кітайскім календары, спартсмены з усяго свету збяруцца ў Пекіне. Ад Токіа да Пекіна з канца лета да пачатку вясны на розных спартыўных арэнах запальваецца адна мара. Кітайская сталіца як «горад двух Алімпіяд» падорыць свету непаўторны «фестываль лёду і снегу».

Старшыня КНР Сі Цзіньпін удзяляе вялікую ўвагу падрыхтоўцы да зімовых Алімпійскіх гульняў у Пекіне і для правядзення Алімпіяды вылучыў чатыры канцэпцыі — «экалагічнасці, сумеснага падзелу, адкрытасці, сумленнасці». Прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта Томас Бах пахваліў гэтую новую канцэпцыю і ацаніў яе, як «новы стандарт Алімпійскіх гульняў». Яна дэманструецца ва ўсіх дэталях у працэсе падрыхтоўкі да зімовых Алімпійскіх гульняў у Пекіне і ўжо цяпер прынесла мноства плённых вынікаў.



## АДКРЫТЫЯ, СУМЛЕННЫЯ, ЭКАЛАГІЧНЫЯ

— Зімовыя Алімпійскія гульні ў Пекіне будуць экалагічнай Алімпіядай. Кітай прытрымліваецца прыярытэту экалогіі, эканоміі рэсурсаў, беражлівага стаўлення да навакольнага асяроддзя, заклаўшы падмурак «прыгожага Кітая» для зімовых Алімпійскіх гульняў. Спартыўны цэнтр «Водны куб» ператворыцца ў «Ледзяны куб», спарткомплекс «Укэсун», які прызначаны для баскетбольных спаборніцтваў, за шэсць гадзін можна падрыхтаваць да спаборніцтваў на лёдзе. На ўсіх аб'ектах спаборніцтваў будзе выкарыстана стапрацэнтна экалагічна чыстая электраэнергія, — падкрэсліў Се Сяаюн. — На чатырох лядовых аб'ектах будуць выкарыстаны новыя хладагенты на аснове двухвокісу вугляроду. Зараз гэта самая экалагічна чыстая тэхналогія вытворчасці лёду ў свеце, пры прымяненні якой выкіды вугляроду блізкія да нуля.

Зімовыя Алімпійскія гульні ў Пекіне будуць Алімпіядай сумеснага падзелу. Кітай прытрымліваецца канцэпцыі сумеснага ўдзелу, сумесных намаганняў і сумеснага падзелу вынікаў. Падрыхтоўка да зімовых Алімпійскіх гульняў выклікала станоўчы грамадскі рэзананс. Кітай паскарае стварэнне пояса спартыўнага і культурнага турызму ў Пекіне і Чжанцзякоў, што актывізуе працаўладкаванне, рост даходаў, узбагачэнне народа. У раёне Чунлі горада Чжанцзякоў, дзе ў рамках зімовых Алімпійскіх гульняў у Пекіне будуць праводзіцца некаторыя спаборніцтвы, кожны пяты займаецца работай, звязанай з зімовымі відамі спорту. «Прыцягненне 300 мільёнаў чалавек да зімовых відаў спорту» стане важнай вяхой у гісторыі іх развіцця ў свеце.

Зімовыя Алімпійскія гульні ў Пекіне будуць адкрытай Алімпіядай. Кітай арыентаваны на сусветную супольнасць, на будучыню і мадэрнізацыю, што дазваляе зрабіць Алімпіяду паскаральнікам адкрытасці. КНР падтрымлівае плённае супрацоўніцтва з такімі арганізацыямі, як Міжнародны алімпійскі камітэт, Міжнародны параалімпійскі камітэт і Міжнародная федэрацыя зімовых відаў спорту, актыўна адбірае і запрашае дзясяткі замежных экспертаў і актыўна пераймае вопыт розных краін у арганізацыі спаборніцтваў і праектаванні трас, стварыўшы платформу адкрытых абменаў і ўзаемнага навучання для Міжнароднага алімпійскага руху.

**Старшыня КНР Сі Цзіньпін удзяляе вялікую ўвагу падрыхтоўцы да зімовых Алімпійскіх гульняў у Пекіне і для правядзення Алімпіяды вылучыў чатыры канцэпцыі — «экалагічнасці, сумеснага падзелу, адкрытасці, сумленнасці».**

Зімовыя Алімпійскія гульні ў Пекіне будуць сумленнай Алімпіядай. Аргкамітэт спрасціў план арганізацыі спаборніцтваў і імкнецца да відовішчнасці і ашчаднасці ў правядзенні спаборніцтваў, узмацняе аўдытарскія праверкі за дзейнасцю па кожным праекце, каб гарантаваць сумленнасць і эфектыўнасць падрыхтоўчай работы. Аргкамітэт таксама выкарыстоўвае самы эканомны спосаб правядзення зімовых Алімпійскіх гульняў. Кітай заўсёды прытрымліваецца беражлівасці, змагаецца з карупцыяй, настойвае на нулявой цярпімасці да допінгу, каб зімовыя Алімпійскія гульні былі чыстымі і бездакорнымі, як лёд і снег.

## РАДАСНЫЯ СУСТРЭЧЫ

— Зімовыя Алімпійскія гульні ў Пекіне таксама будуць бяспечнай Алімпіядай. Арганізацыйны камітэт надае вялікае значэнне прафілактыцы і кантролю эпідэміі. Ставячыся ў вышэйшай ступені адказна да спартсменаў і ўсіх членаў алімпійскай сям'і, аргкамітэт стварыў рабочую групу і групу экспертаў у галіне прафілактыкі і кантролю эпідэміі, а таксама актыўна распрацаваў меры прафілактыкі і кантролю для рэагавання на магчымае развіццё эпідсітуацыі, дэталізуе спосабы прадухілення эпідэміі на стадыёнах.

Адпаведныя ахоўныя меры на Алімпійскіх гульнях у Токіа таксама можна выкарыстоўваць у якасці арыенціру для зімовай Алімпіяды ў Пекіне, каб паскорыць фарміраванне стратэгіі папярэджання эпідэміі ў адпаведнасці з нацыянальнымі асаблівасцямі КНР, — заўважыў Се Сяаюн. — Кітай здольны прадухіліць і кантраляваць эпідэмію, а таксама абараніць жыццё і здароўе кожнага спартсмена і гледача.

Сутыкнуўшыся з наступствамі эпідэміі, КНР, пераадольваючы цяжкасці, няўхільна выконвае падрыхтоўчую работу для дасягнення пастаўленых мэт. Ужо завершана будаўніцтва аб'ектаў для правядзення зімовых Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульняў у Пекіне ў 2022 годзе, упарадкавана ажыццяўляецца арганізацыя спаборніцтваў і функцыянаванне спартыўных арэн, паскорана прасоўваецца работа па забеспячэнні і абслугоўванні мерапрыемстваў. Урачыстае абяцанне, дадзенае Кітаем свету, паступова становіцца рэальнасцю.

«Радасныя сустрэчы на чыстым лёдзе і снезе», зімовыя Алімпійскія гульні ў Пекіне стануць грандыёзнай падзеяй для ўсіх краін свету і арэнай для сумленнага спаборніцтва спартсменаў з усіх куткоў планеты, яшчэ больш раскрыюць алімпійскі дух, яшчэ больш паспрыяюць згуртаванасці і адзінству міжнароднай супольнасці, а таксама ўмацуюць веру ўсяго чалавецтва ва ўзаемадапамогу і рашучасць пераадолець цяжкасці разам. Мы валодаем здольнасцямі і ўпэўненасцю сумесна з народамі ўсіх краін адмовіцца ад некарэктных выказванняў, дзеянняў і шуму, якія супярэчаць алімпійскаму духу і наносяць шкоду развіццю алімпійскага руху, яшчэ раз падорым усяму чалавецтву бяспечную і захапляльную алімпійскую ўрачыстасць, яшчэ раз умацуем упэўненасць усяго свету ў сумеснай барацьбе з пандэміяй, яшчэ раз раскажам свету аб глыбокай канатацыі алімпійскага духу і канцэпцыі Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва.

Пекін вітае вас! Пекін адкрывае свае абдымкі, вітаючы спартсменаў зімовых відаў спорту з усяго свету. Беларусь як моцная краіна ў зімовых відах спорту і адна з асноўных дзяржаў-удзельніц падобных спаборніцтваў, якая дамаглася на іх вынікаў, што ўражваюць. Жадаю беларускім спартсменам новых поспехаў на зімовых Алімпійскіх гульнях у Пекіне! Сардэчна запрашаем у Пекін!

У тэму

## НОУ-ХАУ, 5G І ВЯСЁЛАЯ ПАНДА

Узвядзенне ўсіх спартыўных аб'ектаў для правядзення зімовай Алімпіяды — 2022, якая пройдзе налета з 4 да 20 лютага, было завершана яшчэ паўгода таму. Як паведаміла «Жэньмінь Жыбаа», усяго падчас спаборніцтваў будзе задзейнічана 25 стадыёнаў, размешчаных у Пекіне, Янцыне і Чжанцзякоў. Усе спартыўныя аб'екты пабудаваны і мадэрнізаваны з выкарыстаннем найноўшых інавацыйных і экалагічных тэхналогій.

У кітайскай сталіцы размешчана арэна з самай вялікай у свеце лядовай паверхняй, для астуджэння якой прымяняецца новая энергаэфектыўная сістэма на базе вуглякіслага газу. У працэсе ахалоджвання гэтая сістэма дазваляе сэканоміць 40 працэнтаў ад агульнага спажывання электраэнергіі ў параўнанні з традыцыйнай сістэмай астуджэння пры дапамозе фрэону і іншых холадагентаў, якія не з'яўляюцца экалагічна чыстымі. Пры гэтым новы метад дэманструе практычна нулявы ўзровень выкідаў вугляроду. Такая тэхналогія вырабу лёду ў рамках Алімпійскіх гульняў у свеце выкарыстоўваецца ўпершыню.

Новая сістэма астуджэння валодае здольнасцю цеплавой рэгенерацыі. Так, Нацыянальны канькабежны цэнтр Пекіна будзе выкарыстоўваць цяпло, якое ўтвараецца пры астуджэнні стадыёна, для забеспячэння гарачай вадой спартсменаў, апрацоўкі і іншых мэт, што дазволіць сэканоміць за год да 2 млн кВт энергіі. Лядовыя спартпляцоўкі таксама будуць аснашчаны сістэмамі хімічнага асушвання паветра, якія не наносяць шкоды навакольнаму асяроддзю і дазваляюць зніжаць расход электраэнергіі да 50 %. Істотна зменшыць спажыванне энергіі таксама дазволіла замена традыцыйнай сістэмы асвятлення на фотаэлектрычную сістэму з выкарыстаннем святлодыёдаў.

Адметна, што пераўтвораныя многія спартцэнтры, якія былі задзейнічаны падчас Летняй Алімпіяды 2008 года ў Пекіне. Як адзначае «Жэньмінь Жыбаа», у пачатку праектавання аб'ектаў было прадугледжана іх выкарыстанне пасля Алімпійскіх гульняў у залежнасці ад сезона. Так, напрыклад, на час зімовай Алімпіяды Нацыянальны плавальны цэнтр стане пляцоўкай для кёрлінгу, а пасля ў цёплы час года зноў будзе выкарыстоўвацца для водных відаў спорту.



Алімпійскія збудаванні актыўна ўкараняюць тэхналогіі на базе 5G. У «разумныя» спартыўныя аб'екты будзе ўбудаваная сістэма пазіцыянавання і навігацыі, што дазволіць пазбегнуць гармідару наведвальнікаў. Адным з такіх аб'ектаў з'яўляецца Нацыянальны канькабежны цэнтр. «Гэты аб'ект будзе падобны на смартфон», — заўважыў прадстаўнік цэнтра. Паводле яго слоў, мяркуецца запусціць спецыяльны мабільны дадатак, з дапамогай якога можна будзе не толькі лёгка арыентавацца ўнутры памяшкання, але і ў выпадку неабходнасці атрымаць паслугі перакладу. Такім чынам, наведвальнікі змогуць не толькі адшукаць сваё месца на трыбуне, але і рэстараны, і крамы. Акрамя таго, гледачы могуць нават прыняць удзел у спаборніцтвах пры дапамозе дапоўненай рэальнасці.

Афіцыйным талісманам Алімпіяды ў Пекіне стала вясёлая панда Бін Двень Двень. Яна нагадвае касманаўта, які выкарыстоўвае новыя тэхналогіі для будучыні з бясконцымі магчымасцямі. Форма сэрца на яе левай далоні сімвалізуе гасціннасць краіны. Яркія колеры арэолу ўвасабляюць найноўшыя лядовыя і снежныя спартыўныя трасы.

**Падрыхтаваў Мікалай ЛІТВІНАЎ. Фота БелТА.**

# «ПЕРШ ЗА ЎСЁ — ПРАЎСЯ І НЕ НЫЙ, БРАЦЕ, НАКОНТ НЕЙКАГА «ЗАКРУГЛЕННЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*








«Дзясяткі кіламетраў магнітафонных запісаў — расказы больш як трохсот непасрэдных сведкаў хатынскіх трагедый — склалі змест гэтай кнігі. Тысячы тры кіламетраў дарог — асфальтаваных, палявых, лясных — звязваюць іх, ахвяры фашысцкіх зверстваў. Жывуць яны, гэтыя цудам ацалелыя людзі, па ўсёй Беларусі, у тых 147 вёсках, у якіх мы на працягу 1970—1973 гадоў пабывалі, аб'ездзіўшы трыццаць пяць раёнаў рэспублікі», — пісалі ў прадмове аўтары.

У Беларускім дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва захоўваюцца фонды Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка. Ёсць там і лісты, у якіх яны згадваюць пра сваю сумесную работу.

## «Я прапітваюся матэрыялам»

Рухавіком ідэі, мяркуючы па ўсім, стаў Алесь Адамовіч. Ён даўно задумваўся над стварэннем «сімфоніі галасоў», дзе гістарычная падзея раскрывалася б праз расповеды рэальных людзей. Пасля таго як у 1971-м Адамовіч напісаў «Хатынскую аповесць», ён наракаў: *«Выявіў, падняў, паказаў адну толькі макулінку праўды, кроплю з таго, што ўбачыў, зразумеў, а бяздонны акіян народнай, вогненнай, Хатынскай памяці застаўся, там жа, нячутны, нябачны свету».*

**Пасля выхаду кнігі рэзананс быў нечуваны... І не толькі станоўчы. Знаходзіліся і тыя, каму ўпоперак было сказанае слова непрыхарошанай праўды пра вайну, і тыя, хто зайздросціў поспеху трох суаўтараў.**

Пачнём з ліста Алеся Адамовіча да Янкі Брыля.

*«Артыкулы мае (я ўжо ўлавіў) атрымліваюцца ў той ступені, у якой я прапітваюся матэрыялам і наколькі магу свабодна ўспамінаць тую ці іншую дэталь, факт...»*

Работа над кнігай доўжылася пяць гадоў. У архіве захоўваецца фотаздымак: аўтамабіль, на якім літаратары калясілі па глыбінцы, заехаў у калюжыну ледзь не на ўсе колы. Алесь Адамовіч, схіліўшыся, працягвае руку Янку Брылю, які спрабуе вылезці з машыны...

Пагартаем нататкі Янкі Брыля «Думы ў дарозе». Вось зацемкі за 1971 год:

*«Дванаццаць новых запісаў пра жахі мінулага. Бабкі з папрабіванымі галовамі, — адна з сотні, з дзвюх соцень, адна з тых, каму не папалі ў патыліцу правільна. Былыя дзеці, ужо даўно дарослыя, што ў час расстрэлу ўпалі неяк пад маму або старэйшую сястру і не зайшліся пад трупамі, як многія іншыя дзеці, якіх пасля, хаваючы, даставалі з-пад трупаў «без аніводнае раначкі». Мужчына, трактарыст, якому тады было пяць год, які ацалеў пад мамай, цяпер ужо старэнькай, побач з якою ён сядзіць перад намі».*

Задача была — данесці праўду, непрыхарошаную, тую, якая камусь не прыйдзецца даспадобы, бо не ўпішацца ў ідэалагічнае клішэ.

*«Сакратар райкама па ідэалогіі, сімпатычны І., прызнаўся мне, што піша работу пра партызанскі рух на Клічаўшчыне (па адукацыі ён гісторык), але ў абкаме яму хтосьці там сказаў, што на гэтым, калі ён апублікуе сваю працу, закончыцца яго партыйная кар'ера... Не парушайце зацверджаных, акасцянелых схемаў!..»*

Яны збіраліся парушаць. Але, вядома, усё-ткі не ўвесь матэрыял мог увайсці ў кнігу...

*«Не прыдумаеш нічога такога страшнага, чаго б ужо не было ў жыцці.*

*Бабуля крыкнула на немцаў-карнікаў: «Без'языкія вы!» — і яны ёй выразалі язык, адрэзалі грудзі, сямідзесяцігадовай жанчыне.*

*Другая цётка расказвала (у вёсцы Горваль):*

*Скуб хлопец курэй, якіх яны, карнікі, настралялі. А немец-кухар яму: «Уцякай! Табе засталося цвай мінуты жыць». Угаварыў, а той потым зноў сумняваецца, «дык ён яму яшчэ і нагой пад ср...ку даў, а хлопец — у кукурузу».*


Янка Брыль падчас гутаркі з жыхарамі «вогненнай вёскі» на Магілёўшчыне.

## «Ляжу як старая дзеравяка...»

Кніга задумвалася шматпланавай — каб можна было не толькі пачуць галасы, але і ўбачыць твары апавядальнікаў... Фотаздымкі падчас праекта рабіў Уладзімір Калеснік.

*«Брэст, 2.04.1971.*

*Дарагі Янка!*

*Высылаю здымкі. Старайся даць у «Неман» варыянты, а не ідэнтычныя з тымі, што ўвайшлі ў «Маладосць». А ўвогуле я маю тую навуку на будучае, што здымкаў трэба рабіць як мага больш. Не толькі ў часе запісу ўспамінаў на магнітафон, а заставацца з чалавекам даўжэй і паздымаць яго і ў працы, і ў побыце, і ў прыродзе».*

Між тым, у лістах тройцы суаўтараў адно да аднаго увесь час гучаць скаргі на цяжкія хваробы. Вось і Калеснік скардзіцца:

*«12.01.73*

*Дарагі Янка!*

*Званіў табе ўчора і даведаўся, што ты ў Каралішчавічах. Значыць, творчы настрой працягваецца, дзякуй богу. Я хацеў спытаць, ці абавязкова табе патрэбны здымкі цяпер, ці можа ў палове лютага я адразу прывязу ўсе, што паспею зрабіць...*

*...Скруціла мяне праклятая язва ды падхапіў у апошні дзень сесіі аўстралійскі грып. Ляжу як старая дзеравяка.»*

Усе трое, аднак, падбадзёрваюць адно аднаго, падганяюць у рабоце. У лісце за 16.01.73 Янка Брыль адказвае Уладзіміру Калесніку:

*«Перш за ўсё — праўся і не ный, браце, наконт нейкага «закруглення» — ёсць, безумоўна, такое і ў мяне, але перамагае галоўнае: «жыта сей», а першую палавіну гэтай мудрасці будзем пакуль што ўспрымаць тэарэтычна. І гэта ў мяне не «бодрячество», а стан душы, настрой, у якім бываю куды часцей, чым у нейкай дэпрэсіі, чаго і табе жадаю.*

*Зрабіў я ўжо для нашай кнігі 8 нарысаў... сёння пачаў перапісваць гэтыя два, а тыя шэсць перадрукованы і магу табе іх прыслаць...*

*Канкрэтна: Гулава, каля Петрыкава; 2. Іванова, каля Полацка; 3. сям'я Шчапялёвых; мужчыны, трое, што ўцяклі ад расстрэлу; 5. Савіцкі і іншыя ў Збышыне; 6. Ну, апрацаваў, як асобнае, баброўвічскую Барбарку. Новае: 7. Мардаванне крымігаўскае выбарка і «тэхнічнае» — бронепоездам, душагубкамі; 8. «Дзве старасці» — таго дзядзьку ў Клічаўскім раёне, што ў яго забілі 15 душ сям'і і цяпер, як бабка казала, «у дзеда галоўка баліць» (памятаеш — сядзеў на лавачцы і ні слова, толькі ўсміхаецца)...*

*Хочацца зрабіць асобны вялікі нарыс, з меншымі і большымі малюнкамі-расказамі, пра дзяцей і пад пятлёй. Ужо спланаваў. І другое — як забівалі Красніцу (на Быхаўшчыне)».*

## «Цягні свой раздзел!..»

Зрэшты, калі Адамовіч быў ідэйным рухавіком праекта, Брыль, як бачыцца з лістоў, адказваў за беларускую мову: справу мелі з сотнямі сведчанняў на розных дыялектах, задача была — захаваць аўтэнтычнасць, асаблівасці маўлення, і ў той жа час пакінуць тэкст чытэльным.

Ліст Янкі Брыля да Уладзіміра Калесніка за 23.01.1973 г.:

*«Суткі гасціў тут у мяне Адамовіч... Саша ў поўным рабочым настроі, нават і на нядзелю не захацеў застацца: «Работа!» Абяцае да канца лютага даць... 200 старонак на машынцы. Дапамог твой наказ на здымку: «Цягні свой раздзел!..»*

*Я пасылаю сёння на машынку свой дзясяты матэрыял — расказ Вольгі Міціч. Застаецца ў мяне спланаваны расказ пра шасцёх падлеткаў, да якога даю эпіграфам словы адной жанчыны з Кіраўскага раёна: «Маленькіх хлопчыкаў, як і бабаў, яны тады не стралялі, а ўжо як катораму гадоў дзесяць — такіх разам з мужчынамі...»*

*Як будзеш пісаць сваю «Вірлівую Шчару» — або не чапай вельмі моўна двух Ламакоў, Аляксея ды Радзівона, або і наогул абмяжуйся, калі не будзе вялікай патрэбы, старым Павачкай — на Вялікую Волю ў нарысе, можа, хопіць і яго? А зрэшты, як правільна гаворыць Саша, паўтораў (дзе больш гаворачы пра тое ж, а дзе менш, толькі не ўспамінаю-*


Алесь Адамовіч з жыхарамі в. Брыцалавічы (Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць).

*чы) нам няма чаго баяцца: яны і непазбежныя, у пэўнай меры, у кнізе дакументальнай, якую, дарэчы, будуць чытаць «на выбарку».*

*Шчыра кажучы, мне ўжо трэба, відаць, трохі адысціся ад нашага страшнага матэрыялу: пасля даволі ўпартага глядзення на яго прабываеш у ім, не бачу пакуль што новых формаў падачы асобнымі нарысамі.»*

А вось ліст Алеся Адамовіча да Янкі Брыля за 25.08.1973, у якім ён згадвае наказ Уладзіміра Калесніка пра «цягнуць раздзел», і пацвярджае ролю Брыля як эксперта па беларускай мове:

*«Дарагі Янка!*

*Не вельмі мне тут пашанцавала: раз і яшчэ раз захварэў. Ды застаўся трохі, каб у цяпле марскім трохі падраўняцца. Але ва ўсякім дрэнным бывае і лепшае. Пакуль холад стаяў і хварэў я, цягнуў раздзел. І выцягнуў да 120 старонак. Буду дапрацоўваць, але здаецца, атрымалася нешта патрэбнае. Мабыць, можна будзе гэтым абагульніць кнігу, бо тут спроба адказаць, што такое Хатыні ў глабальным значэнні. Так, яно. Раздзел утварыў Баркі (адны і другія), Красніцу і яшчэ. Выкарыстаў Валодзевы запісы і думкі таксама. Але тут будзе, мабыць, спрэчка — толькі ўжо наадварот. Ён запісы даў дакладнейшыя, чаго мы і дабіваліся раней — з усёй украінскай стыхіяй. Але такое і столькі чытач не адолее ў такім выглядзе. Прыдзецца зрабіць тут мову чуць болей беларускай і меней украінскай. Будзем вас прасіць, Іван Антонавіч!*

*Ну вось, яшчэ 120! А вы казалі: хопіць 15-20 аркушаў! Дай бог у 35-40 увабраць — калі яшчэ Міншчыну выкарыстаем.»*

## «Мажліва, ён замардоўвае сябе работай...»

Вядома, не ўсё ў такім вялікім праекце ішло гладка. Здараліся накладкі і падчас публікацый, пра што сведчыць ліст Уладзіміра Калесніка да Янкі Брыля:

*«Брэст, 3.10.73.*

*Дарагі Янка!*

*Атрымаў твае матэрыялы — цяжкія. Не думаў нават, што столькі сабярэцца па Міншчыне. Для нашай кніжкі пакуль што накідаў пару старонак чарнавога ўступу для раздзельчыка пра жанчын. Праявіў плёнкі і рады быў, што парваная плёнка з Мсціжаў, якая мне будзе такая патрэбная, усё ж сяк-так выйшла і можна будзе скарыстаць тыя кадры. Наогул фотаматэрыял на гэты раз удаўся на славу і я яго нарэшце навучыўся сістэматызаваць, так што блытаніна будзе выключана. Пра публікацыю ў вераснёўскім нумары чуў шмат добрых выказванняў ад людзей, хоць мне было прыкра, што здымак Барадаўкі падпісаны як бабуля Акушэвіч. Як маглі праблытаць? Я ж на левым баку скрозь падпісваў.*

*...Шкада, што нездаровіцца Сашы. Мажліва, ён замардоўвае сябе работай, табе варта было б з ім пагаварыць наконт больш бяспечных адносін да быстраплыннага часу — сябе абагнаць і цераз сябе пераскочыць немажліва, а ў сталым узросце і спрабаваць гэта рабіць сорамна».*

Праца над такім цяжкім матэрыялам не толькі падрывала здароўе, але і вымагала пэўнай маральнай вышыні. У 1974-м Брыль занатоўвае:

*«Мы напружана працавалі, Адамовіч, Сёмуха (рэдактар кнігі. — **Л. Р.**) і я, калі мне пазванілі выступіць па радыё, яшчэ раз гаўкнуць на Салжаніцына, прычым — неадкладна!.. І неяк вельмі ж проста і неадкладна я адмовіўся, не бачачы ў гэтым подзвігу і дагэтуль. Несалідна гэта — так доўга пераконваць саміх сябе ў тым, што паступілі правільна, прымушаць людзей брахаць ужо не на страх, а на брэх. І не тых дапускаць, што самі гэтага прагнуць, а «правяраючы лаяльнасць», «перавыхоўваючы» «непрыручаных».*

Пасля выхаду кнігі рэзананс быў нечуваны... І не толькі станоўчы. Знаходзіліся і тыя, каму ўпоперак было сказанае слова непрыхарошанай праўды пра вайну, і тыя, хто зайздросціў поспеху трох суаўтараў. Пачытаем ліст Алеся Адамовіча ад 27.06.75 да Янкі Брыля, напісаны падчас чарговага адпачынку ў доме творчасці дзесь на моры:

*«Ну, наслухаўся я тут ад В. пра ўсіх, каго толькі ўспомніла. А яшчэ Граніна дачка тут, дык у яе вочы робяцца вялікія, здзіўленыя: што ж там за бел. пісьменнікі? Як раскрые В. роцік — як з каракаціцы чарніла! Я ўжо бегаю на другі пляж. Але ёй матрац плывучы патрэбен — знойдзе. І зноў слова скажа — яшчэ пра каго-небудзь. А за гэтым, каб толькі ж яе мілы характар, але і рэха ўсіх іхніх там, у Мінску, размоў.*

*З усяго плявузгання адно ўсё ж запала мне. Шкада, што не паслухаліся мяне (Валодзя, як заўсёды, пад настрой не захацеў слухаць і цябе павярнуў). Усё ж трэба было аддаць увесь наш ганарар, калі не на помнік, дык у які-небудзь камітэт. І не ў тым справа, што гавораць усяляк, а ў тым, што сам я адчуваў, што трэба так абавязкова зрабіць.*

*Цяпер ужо пачакаем прэміі, абяцанай Ананьевым (У 1967 годзе А. Ананьеў быў абраны членам Праўлення Саюза пісьменнікаў СССР па рускай літаратуры ў рэспубліках СССР. — **Л. Р.**) Ёсць тут чаму і парадавацца».*

Абяцаную прэмію кніга «Я з вогненнай вёскі» так і не атрымала. Але работу над ёю кожны суаўтар лічыў важнай падзеяй у сваёй творчай біяграфіі. Адамовіч пасля ўзяўся за напісанне разам з Даніілам Граніным «Блакаднай кнігі» па тым жа прынцыпе — сабраць сведчанні тых, хто перажыў ленінградскую блакаду. А калі праз шмат гадоў журналістка звярнулася да Брыля з просьбай распавесці пра работу над кнігай-рэквіемам, той, ужо народны пісьменнік, адмовіўся: «Не магу зноў вяртацца да гэтай тэмы, надзвычай цяжка. Потым вы і самі зразумееце, пра што кажу...»

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ЧЫМ БОЛЬШ КНІГ, ТЫМ БОЛЬШ СВЯТЛА!

### 4-5 верасня ў Капылі пройдзе Дзень беларускага пісьменства

**На мінулым тыдні «Звязда» анансавала правядзенне Дня беларускага пісьменства ў Капылі. Прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў Беларусі ўчора распавялі аб праектах, якія будуць прадстаўлены на свяце.**



Фота БелТА.

**Алена СТЭЛЬМАХ, першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі,** адзначыла, што разам з Мінскім аблвыканкамам рыхтуецца мерапрыемства ў гонар літаратараў Капыльшчыны. Будзе арганізавана памятнае месца: адкрыюць помнік, а таксама высадзяць дрэвы. Але гэта далёка не адзіная акцыя, якая плануецца ў межах свята. Алена Стэльмах дадае:

— У першую чаргу хочацца сказаць аб стварэнні серыі кніг, прысвечаных знакамітым людзям Беларусі. Іх аўтарам з'яўляецца пісьменнік Валерый Чудаў. Кнігі пабачаць свет у серыі «Школьная бібліятэка». А сам праект будзе прадстаўлены падчас Дня беларускага пісьменства.

З 4 да 5 верасня Капыль стане пляцоўкай для мноства аўтараў. Так, выдавецтва «Чатыры чвэрці» плануе прэзентаваць новыя кнігі Сяргея Трахімёнка. Па словах Жаны Клімянок, намесніка галоўнага рэдактара выдавецтва, «Калі хвост віляе сабакам» і «Набеліат» выйшлі да юбілею пісьменніка. Пазнаёміцца з выданнямі і задаць свае пытанні Сяргею Трахімёнку можна будзе падчас правядзення свята.

Цікавую і даволі вялікую праграму рыхтуе магілёўскае аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі. Старшыня аддзялення Алесь Казека адзначыў:

— Наша аб'яднанне плануе прадставіць праграму пад назвай «Нашых сэрцаў адкрытых адзіная мова». Яна будзе складацца з чатырох блокаў. Знаёмства з выбітнымі магілёўскімі пісьменнікамі, чытанне лірычных вершаў з восеньскай тэматыкай, а таксама дэкламаванне любімых вершаў класікаў і сучасных беларускіх паэтаў.

